

ІНЦЫДЭНТ З ЭФЕКТАМ БЕСЧАЛАВЕЧНАСЦІ

2

СТУДЭНЦКАЕ ЖЫЦЦЁ — ПРАЗ ПРЫЗМУ ГІСТОРЫІ

ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

22 ЛІПЕНЯ 2021 г. ЧАЦВЕР № 138 (29507)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл МІХАДЗЮК, намеснік міністра энергетыкі:**

*«Беларусь і дзяржкарпарацыя «Расатам» прапрацоўваюць новыя напрамкі супрацоўніцтва. У прыватнасці, разглядаюцца праекты па стварэнні на базе НАН Беларусі сумеснага цэнтра ядзерных і навуковых даследаванняў, стварэнні сумесных лабараторый у галіне ядзернай медыцыны, а таксама па лічбавізацыі аб'ектаў атамнай энергетыкі і электрасеткавай інфраструктуры. Акрамя таго, разглядаюцца магчымасці рэалізацыі сумесных праектаў у сферы квантавых тэхналогій і новых матэрыялаў, даследаванняў у галіне сельскай гаспадаркі і радыебіялогіі. Партнёрства будзе развівацца і з іншымі расійскімі кампаніямі і арганізацыямі, у тым ліку ў сферы навукова-тэхнічнага суправаджэння эксплуатацыі БелАЭС і падаўжэння яе тэрміну службы, абыходжання з адпрацаваным ядзерным палівам і радыеактыўнымі адходамі».*

## КОРАТКА

• **У Беларусь прыбываюць расійскія вайскоўцы з тэхнікай для падрыхтоўкі вучэння «Захад-2021».**

• На мосце «Усходні» праз Нёман у Гродне прайшоў хрэсны ход з іконай Жыровіцкай Божай Маці.

• **Мінтранс прапануе беларусам абмеркаваць пытанні аўтаперавозак пасажыраў. Заўвагі і прапановы можна выказаць у адмысловай тэме на Прававым форуме Беларусі.**

• Песні дзвюх кінаэпох прагучаць у Верхнім горадзе 24 ліпеня ў выкананні капэлы «Санорус».

• **Пад Лагойскам за распаўсюджванне наркотыкаў затрыманы два студэнты-замежнікі.**

ISSN 1990 — 763X

# З іскры нараджаецца досвед



Фота БелТА.

Вытворчы студэнцкі атрад «Сельмаш» імя Героя Савецкага Саюза Б. А. Царыкава працуе на «Гомсельмашы». У складзе атрада сем чалавек, якія былі задзейнічаныя на зварачным участку. Гэта навучэнцы Гомельскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа электратэхнікі і Гомельскага дзяржаўнага аўтамеханічнага каледжа. Кожны з маладых людзей робіць уклад у стварэнне сельскагаспадарчых машын. «Гомсельмаш» выконвае вялікі аб'ём заказаў, таму не выключана, што для студэнцкіх атрадаў тут будзе не адна працоўная змена.

*На здымку:* студатрадавец **Уладзімір ЯКІМЧЫК.**

## Малая радзіма

# МУРАЛЫ, РАТОНДА, АБНОЎЛЕНЫ ПАРК...

### Як развіваецца гродзенскі горад-спадарожнік Скідзель, дзе сёлета адбудуцца абласныя «Дажынкі»

**Да фестывалю працаўнікоў сельскай гаспадаркі Гродзеншчыны тут пачалі рыхтавацца яшчэ летась. Можна сказаць, што горад амаль поўнасцю гатовы да галоўнага свята хлебаробаў, якое адбудзецца ў верасні.**

СТАР. 4




Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

## Прыгажосць побач

# Водар лаванды вабіць на Веткаўшчыну

**Як выглядае «беларускі Праванс», дакладна ведаюць жыхары глыбінкі Гомельскай вобласці. Французскія пейзажы тояцца ў вёсцы Рудня Спаніцкая Веткаўскага раёна. Менавіта тут знаходзіцца адна з самых буйных у краіне плантацый лаванды.**



Гаспадар кветкавага раю ўсіх адценняў фіялетавага — **фермер Алег ДАБУЛЯК**. Каб сфатаграфавацца, у яго лавандавае поле людзі прыязджаюць з усёй краіны. Штогод «французскія фотасесіі» з веткаўскай «прапіскай» літаральна ўзрываюць Instagram, упрыгожваюць профілі многіх беларускіх інстаблогераў і фатографаў.

— Лаванда — гэта пах, спакой. Гэта прыгажосць, жыватворны алей. Гэта жыццё, — кажа Алег Дабуляк.

Ён заўсёды падкрэслівае, лаванда — у яго фермерскай справе — для душы.

— Людзі прыязджаюць, глядзяць, атрымліваюць асалоду ад водару, фатаграфуюцца, шчыра кажучы: быццам у адпачынак з'ездзілі. Прыязджаюць да нас з Гродна, Мінска, Жлобіна, Мазыра. Дзякуючы, пішуць у Instagram. З нецярпеннем чакаюць чарговага сезона цвіцення, каб прыехаць сюды зноў. Вось што каштоўна для нас, — працягвае ён.

СТАР. 4

На абмеркаванне

# ЭТАП ЗАВЕРШАНЫ, ПРАПАНОВЫ ЎЛІЧАНЫ

## Вынік работы Канстытуцыйнай камісіі будзе прадстаўлены на разгляд Прэзідэнту

**Учора прайшло дзявятае пасяджэнне Канстытуцыйнай камісіі. На ім былі падведзены вынікі работы па распрацоўцы прапаноў па змяненні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, паведамляе БелТА. Больш падрабязна пра некаторыя з іх расказаў старшыня Канстытуцыйнай камісіі, старшыня Канстытуцыйнага суда Пётр МІКЛАШЭВІЧ.**

У прыватнасці, агучаны прапановы **аб тэрмінах прэзідэнцкіх і парламенцкіх паўнамоцтваў.** «Прапанавана ўдакладніць канстытуцыйныя тэрміны знаходжання на пасадзе Прэзідэнта, устанавіўшы, што **адна і тая ж асоба можа быць Прэзідэнтам не больш за два тэрміны**», — сказаў Пётр Міклашэвіч. Што датычыцца **парламента, тэрмін яго паўнамоцтваў прапануецца павялічыць з чатырох да пяці гадоў**. Змены могуць закрануць і парадак правядзення сесій парламента — адна сесія з верасня да чэрвеня на працягу года.

У раздзеле «Прэзідэнт. Парламент. Урад» прапанавана ўдакладніць статус і функцыі Прэзідэнта, парламента і ўрада, пераразмеркаваўшы паўнамоцтвы названых органаў улады, зыходзячы з іх канстытуцыйных функцый. **Вызначыць у поўным аб'ёме заканадаўчыя паўнамоцтвы парламента, пашырыць яго кантрольныя паўнамоцтвы і ўдзел у вырашэнні кадравых пытанняў.**

Прапануецца таксама пашырыць паўнамоцтвы ўрада і яго самастойнасць у прыняцці рашэнняў у сферы выканаўчай улады. «Замацаваць паўнамоцтвы ўрада ўносіць Прэзідэнту прапановы аб прызначэнні і адкліканні дыпламатычных прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусь у замежных дзяржавах і пры міжнародных арганізацыях. **У мэтах павышэння самастойнасці ўрада выключыць права Прэзідэнта адмяняць акты ўрада**», — адзначыў старшыня КК.

«Па раздзеле «Асоба. Грамадства. Дзяржава» прапанавана замацаваць сучасныя прынцыпы сацыяльнай дзяржавы, дзе дабрабыт здзейсніцца пры дапамозе працы і кожны ўносіць пасільны ўклад у ажыццяўленне задач дзяржавы і грамадства. **Устанавіць, што шлюб — гэта саюз жанчыны і мужчыны, захаваць традыцыйныя каштоўнасці сям'і і шлюбу**», — сказаў Пётр Міклашэвіч.



Фота БелТА.

У раздзел «Пракуратура, Камітэт дзяржаўнага кантролю» **прапануецца ўключыць главу аб упаўнаважаным па правах чалавека** з вызначэннем яго канстытуцыйнага статусу, парадку прызначэння і асноўных паўнамоцтваў. Такім чынам, уводзіцца новы праваабарончы інстытут у мэтах дадатковай гарантыі абароны правоў і свабод чалавека для эфектыўнай сувязі паміж грамадзянамі і ўладай у праваабарончай сферы», — распавёў Пётр Міклашэвіч.

На гэтым важны этап работы Канстытуцыйнай камісіі завяршыўся. Усе раздзелы Асноўнага Закона, магчымыя змяненні разгледжаны. «Прапануецца ў канчатковым выніку ўнесці змяненні ў 59 артыкулаў Канстытуцыі, уключыць у Канстытуцыю 16 новых артыкулаў, выключыць два», — адзначыў старшыня Канстытуцыйнай камісіі.

Пётр Міклашэвіч падкрэсліў, што Канстытуцыйная камісія завяршыла распрацоўку прапаноў па змяненні Асноўнага Закона ў адпаведнасці з графікам і ва ўстаноўлены тэрмін. Паводле яго слоў, сёння ўсе сфармуляваныя прапановы камісіі будуць прадстаўлены Прэзідэнту. «У далейшым адбудзецца пасяджэнне Канстытуцыйнай камісіі з удзелам кіраўніка дзяржавы, на якім будуць разгледжаны заўвагі канцэптуальнага характару, выкладзеныя некаторымі членамі Канстытуцыйнай камісіі. Канчатковы варыянт змяненняў Канстытуцыі будзе вынесены на ўсенароднае абмеркаванне і ў далейшым з папраўкамі пасля ўсенароднага абмеркавання праект змяненняў Канстытуцыі будзе вынесены на рэспубліканскі рэферэндум», — паведаміў Пётр Міклашэвіч.

Гарачая тэма

# ІНЦЫДЭНТ З ЭФЕКТАМ БЕСЧАЛАВЕЧНАСЦІ

## Жорсткае абыходжанне нашых суседзяў з іракскімі мігрантамі мала каго пакідае раўнадушнымі

**Афіцыйны прадстаўнік Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі Антон БЫЧКОЎСКІ паведаміў, што Літва афіцыйна ніяк не адрэагавала на інцыдэнт з іракскімі бежанцамі. Нагадаем, раніцай 18 ліпеня вайскоўцы заставы «Геранёны» Лідскага пагранатрада выявілі 14 грамадзян Ірака. На наступны дзень на гэтым жа ўчастку былі выяўлены яшчэ сем змардаваных замежнікаў, якія прадставіліся грамадзянамі Ірака, а ў населеным пункце Клявіца яшчэ пяць чалавек — цяжарная жанчына, двое дзяцей і двое мужчын. Яны перайшлі Дзяржаўную граніцу з боку Літвы. Не па сваёй волі.**

«Затрыманыя расказалі, што ў Літве знаходзіліся ў лагеры для бежанцаў. Па словах грамадзян Ірака, супрацоўнікі Службы аховы дзяржаўнай граніцы пры МУС Літвы выклікалі іх на допыт і прымушалі даваць паказанні аб подкупе беларускіх пагранічнікаў за дапамогу ў парушэнні граніцы. Пры гэтым затрыманых не кармілі, не давалі піць, а «гутарка» суправаджалася ўдарамі тэлескапічнай дубінкай, пра што сведчаць раны і сінякі на розных частках цела замежнікаў. Адразу пасля допыту, як растлумачылі іракцы, праваахоўнікі прывезлі іх да дзяржаўнай граніцы і пад пагрозай прымянення зброі прымусілі сысці на тэрыторыю Беларусі», — гэтыя цытаты з паведамлення Дзяржпагранкамітэта сталі галоўнай навіной і тэмай для абмеркавання ў многіх краінах. Прэзідэнт Беларусі адкрыта назваў такія паводзіны літоўцаў у адносінах да мігрантаў сучаснымі праявамі фашызму і нацызму. А афіцыйны Вільнюс маўчыць. «Афіцыйнай рэакцыі ад літоўскіх калег з нагоды інцыдэнту з пераходам беларускай граніцы іракскімі мігрантамі 18 ліпеня не паступала. У цэлым узаемадзеянне з Літвой па дадзеных пытаннях складана назваць канструктыўным», — адзначыў Антон Бычкоўскі ў каментарыі БелТА.

### ГІСТОРЫЯ ПАЎТАРАЕЦЦА

Аб дадзеным інцыдэнце, які ў нармальнага цывілізаванага жыхара Еўропы не павінен нават укладвацца ў галаве, выказаліся беларускія парламентарыі. «Падзеі, якія адбываюцца вакол нашай краіны, прычым закранаюць як знешнія, так і ўнутраныя аспекты, яшчэ раз прымушаюць задумацца аб тым, што гісторыя паўтараецца, — гаворыць **член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Ірына ДАЎГАЛА.** — Нам удалося перамагчы ў найцяжэйшай крывавай барацьбе падчас Вялікай Айчыннай вайны, цяпер ідзе гібрыдная вайна. І тыя, хто нам яе аб'явіў, не грэбуюць абсалютна ніякімі спосабамі і метадамі. Як той казаў, у ход ідзе любая зброя: не толькі слова, а ўжо і жанчыны, і дзеці. Але гэта ж ужо было восемдзесят гадоў назад. Ёзэф Гебельс, ідэолаг нацызму, казаў, што «мы дамагаемся не праўды, а эфекту». І сёння ўсё паўтараецца — дамагаюцца не праўды, а эфекту. Гэта ж эфектна — паказальна вышturхнуць за мяжу цяжарную жанчыну, дзяцей, каб застрашыць іншых, хто надумае прыйсці ў пошуках дапамогі і прытулку... Калі раней доблесць азначала перамагчы ў вайне, то сёння варта згадаць словы Сенекі, які казаў, што найвышэйшая доблесць — не праліваць нічыёй крыві, забяспечыць спакой усяму свету і мір свайму стагоддзю... Менавіта гэтым павінны кіравацца мы, каб мець права лічыцца сапраўднымі людзьмі.

### «ПА ВЫНІКАХ ІНЦЫДЭНТУ МОЖНА СПРАГНАЗАВАЦЬ ШЭРАГ НАСТУПСТВАЎ»

Фашысцкія метады ў адносінах да мігрантаў могуць пацягнуць рост актыўнасці радыкальных элементаў ужо ўнутры Еўрапейскага саюза. Пра гэта карэспандэнту БелТА заявіў **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Сяргей КЛІШЭВІЧ,** каменціруючы жорсткае абыходжанне пагранічнікаў Літвы з іракскімі мігрантамі.

«Па выніках інцыдэнту можна спрагназаваць шэраг наступстваў. Напрыклад, падаўжэе маршрут і канчатковы пункт перакідвання мігрантаў. Калі раней яны здаваліся літоўскім патрулям у прыгранічных раёнах, не ставячы мэтай тайнае перамяшчэнне, то цяпер будуць старацца пранікнуць углыб тэрыторыі Літвы, каб іх не выправадзілі ўзброеныя фарміраванні, якія дзейнічаюць на граніцы. Адпаведна, калі да гэтага з мігрантамі сутыкаліся ў асноўным сельскія жыхары паўднёвых раёнаў Літвы, то цяпер кола такіх кантактаў моцна пашырыцца. Брусель рызыкуе атрымаць афрыканскія і мусульманскія бунты не толькі на тэрыторыі Літвы, але і ў шэрагу еўрапейскіх сталіц, дзе пражываюць буйныя дыяспары», — сказаў парламентарый.

Сяргей Клішэвіч параіў літоўскаму боку звярнуць увагу не на ўяўныя дзеянні Мінска па «арганізацыі міграцыі», як гэта падаецца ў літоўскіх СМІ, а на карупцыйны складнік у органах дзяржаўнай пагранічнай службы Літвы.

### «ЗАХОДНІМ КРАІНАМ ПРЫЙШОЎ ЧАС БРАЦЦА ЗА РОЗУМ»

**Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Андрэй САВІНЫХ** пракаменціраваў «Звяздзе» папрокі ў садзейнічанні нелегальнай міграцыі, якія паступаюць у адрас Беларусі.

«На працягу многіх гадоў Рэспубліка Беларусь выконвала функцыю аховы ўсходніх меж Еўрапейскага саюза. Мы трацілі грошы, у асноўным свае, частка паступала ў рамках праграм Усходняга партнёрства, для таго каб прадухіляць патокі нелегальнай міграцыі. Але цяпер пасля ўвядзення санкцый, з улікам крызісу, выкліканага COVID-19, сродкаў становіцца менш. Пачалося абвастрэнне сітуацыі на нашых паўднёвых межах, і частка пагранічных войскаў была перадыслацыравана для забеспячэння бяспекі паўднёвай граніцы. Вядома, на гэтым фоне эфектыўнасць дзеянняў розных нелегальных груп па перапраўцы мігрантаў, у тым ліку і па беларускім маршруце, стала больш відавочная і выніковая», — адзначыў парламентарый.

Па словах Андрэя Савіных, перакладваць адказнасць за гэта на Рэспубліку Беларусь проста смешна. «Тут трэба казаць пра тое, што Еўрапейскі саюз не займаўся аховай уласных меж, гэта па-першае. А па-другое, у Еўрапейскага саюза няма разумнай прадуманай палітыкі па пытанні міграцыі. Краіны калектыўнага Захаду ствараюць сітуацыю ўзброенага канфлікту ў шэрагу краін, перш за ўсё ў Лівіі, Сірыі. Яны ўрываюцца ў Ірак, Афганістан. Дэстабілізуюць гэтыя краіны, робячы ўмовы жыцця там невыноснымі. І натуральна, што насельніцтва бяжыць ад вайны ў больш багатыя краіны. І гэтымі краінамі аказваюцца краіны Еўрапейскага саюза. Гэта значыць, яны самі ствараюць праблему, а цяпер не ведаюць, як яе вырашыць, перакладваюць з хворай галавы на здаровую», — падкрэсліў ён.

Парламентарый канстатаваў, што заходнім краінам прыйшоў час брацца за розум і адмаўляцца ад той палітыкі не толькі ў міграцыйнай, але і ў эканамічнай і ў іншых галінах, якая па сутнасці вядзе калектыўны Захад да катастрофы.

**Валерыя СЦЯЦКО, Вераніка КАНЮТА.**

### ТЫМ ЧАСАМ



У Літве ў цэнтры для мігрантаў адбыліся беспарадкі. Пра гэта заявіў мэр Ігналінскага раёна (у якім пражываюць 50 мігрантаў) Юстас Расікас, паведамляе Delfi. «Сёння ў нас быў першы «гарачы» дзень. Пачаліся канфлікты. Першы здарыўся, калі ў лагер вярнулі перахварэлую на COVID-19 дзяўчыну, яна адмовілася вярнуцца ў выдзеленае ёй памяшканне, разгарэўся канфлікт. На яго вырашэнне сышло шмат часу», — сказаў Юстас Расікас. Паводле яго слоў, было вырашана перавесці дзяўчыну ў іншае месца, але напружанне засталося.

Мэр таксама расказаў, што нелегальныя мігранты выстаўляюць усё новыя патрабаванні. «Нашы мігранты адмовіліся ад ежы. Патрабавалі вярнуць ім мабільныя тэлефоны. Нарастае незадаволенасць, скажам так. З'яўляецца ўсё больш патрабаванняў, гэта выклікае ў нас непакой. Сёння прывезлі дадатковыя агароджы, каб выдзеліць ім вялікую тэрыторыю для прагулак, мы выконваем іх патрабаванні. Служба грамадскай бяспекі выдзеліла чатырох ахоўнікаў. Але ці могуць чацвёра супрацьстаяць пяцідзесяці?» — заявіў мэр.




# ЗАКЛЮЧНАЕ, АЛЕ НЕ АПОШНЯЕ СВЯТА

## «Вытокі» едуць у Салігорск

**Спартыўна-масавае мерапрыемства «Вытокі. Крок да Алімпу», якое гэтым летам аб'яднала ўсю краіну, пераязджае ў заключны рэгіён — Мінскую вобласць. Тут свята з 22 да 24 ліпеня прыме горад моцных людзей — Салігорск.**

Сярод усіх гарадоў, якія прымалі фестываль «Вытокі», Салігорск — самы малады. Горад заснаваны ў 1958 годзе ў сувязі з адкрыццём і прамысловай распрацоўкай калійнай солі. Але нягледзячы на яго маладосць, гасцям горада ёсць на што паглядзець. Перш за ўсё, вядома, салігорскія тэрыконы — месцы захавання адходаў калійнай вытворчасці, якія знаходзяцца каля прадпрыемства «Беларуськалій». Краявіды салігорскіх гор нібыта сышлі з фантастычных фільмаў пра пакарэнне космасу. Таму не дзіўна, што ў сацыяльных сетках гэта самая папулярная салігорская славутасць. Але, акрамя тэрыконаў, у Салігорску можна ўбачыць... Эйфелеву вежу, гарадскі парк Чатырох стыхій (што вельмі сімвалічна для горада шахцёраў), цікавую савецкую архітэктуру — пабудовы, упрыгожаныя вітражамі і пано, фантаны, помнікі савецкіх часоў.

Фестываль «Вытокі. Крок да Алімпу» ў Салігорску пачнецца там, дзе бяруць вытокі гісторыя гэтага краю. У першы дзень свята, 22 ліпеня, у Духоўна-адукацыйным цэнтры Прыхода храма Пакрова Прасвятой Багародзіцы стартуе праграма на тэму гісторыка-культурнай спадчыны і адбудзецца круглы стол на тэму яе прасоўвання. Свята-Пакроўскі храм — самая старажытная праваслаўная святыня Салігоршчыны. Царква заснавана ў 1795 годзе ў вёсцы Чыжэвічы. За сваю гісторыю храм перажыў пажары, акупацыі, войны, але захаваўся і сёння з'яўляецца помнікам гісторыі і культуры.

Не застанецца ўбаку ад свята і галоўнае прадпрыемства горада — «Беларуськалій». У галоўным упраўленні прадпрыемства, у самым цэнтры горада 22 ліпеня адкрыюцца выстаўка «Кола часу» і выстаўка дзіцячага малюнка, таксама пройдзе лекцыя-прэзентацыя «Сучаснае беларускае выяўленчае мастацтва». А вечарам гэтага ж дня ў скверы «Беларуськалій» пройдзе ўнікальны канцэрт арганнай музыкі «Мой крок да Алімпу» ў выкананні Валерыя Шмата. На другі дзень фестывалю, 23 ліпеня, у Цэнтры творчасці дзяцей і моладзі запланаваныя семінары па папулярызацыі творчых і інавацыйных праектаў. Традыцыйная культурна-эканамічная праграма «Капітал мясціны» адбудзецца ў навукова-вытворчым аб'яднанні «Пасат». Яе ўдзельнікі абмяркуюць распрацоўку і прасоўванне нацыянальных і рэгіянальных брэндаў.

З кожным годам у Салігорску становіцца больш спартыўных аб'ектаў. Летась у горадзе з'явілася лыжаролерная траса. У пачатку 2021 года на спартыўнай карце горада з'явіўся тэнісны манеж, які стаў важнай часткай аднаўленага спарткомплексу «Шахцёр». Дарэчы, комплекс «Шахцёр» — спартыўная славутасць горада. А ў пачатку ліпеня 2021-га ў Салігорску былі ўрачыста адкрытыя скейт-парк і ролер-трэк. У гонар іх адкрыцця ў горадзе ўпершыню прайшлі буйныя міжнародныя спаборніцтвы. Таму праводзіць тут свята, прысвечанае 30-годдзю Нацыянальнага алімпійскага камітэта, — вельмі сімвалічна.

Галоўная частка фестывалю «Вытокі. Крок да Алімпу» — спартыўны квэст — пройдзе ў самым сэрцы горада, на Цэнтральнай плошчы. Кожны жадаючы зможа праверыць свае сілы ў розных відах спорту і атрымаць каштоўныя прызы. Квэст у Салігорску запланаваны адметны. Пакуль беларускія спартсмены будуць змагацца на самых галоўных спаборніцтвах — Алімпійскіх гульнях у Токіа, свой першы крок да алімпу ў Салігорску зробяць маладыя спартсмены. Магчыма, сярод іх апынуцца і будучыя алімпійцы. У Салігорска ёсць усе ўмовы, каб выхаваць моцных спартсменаў, у чым мы зможам пераканацца ўжо ў выхадныя.

На гэтым спартыўна-масавае мерапрыемства «Вытокі. Крок да Алімпу» не заканчваецца. У канцы жніўня ў Мінску пройдуць грандыёзны фінал і падвядзенне вынікаў фестывалю. Як адзначалі арганізатары, людзі з гарадоў, дзе ўжо быў фестываль, просяць прывезці яго ў наступным годзе. Падтрымаць святочную эстафету жадаюць і іншыя гарады. Крок да Алімпу можа зрабіць кожны.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Жыллёвая палітыка

# Мінчане змогуць будавацца з дзяржпадтрымкай і ў іншых гарадах краіны

**Як вядома, самыя вялікія чэргі тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, знаходзяцца ў сталіцы нашай краіны. І вырашыць кватэрнае пытанне для ўсіх без выключэння гарадскіх чаргавікоў — праблема, уладзіць якую проста будаўніцтвам новага жылля, хутчэй за ўсё, не атрымаецца, але...**

Цяпер рыхтуецца праект указа аб мерах па аказанні дзяржаўнай падтрымкі ў жыллёвым будаўніцтве. Прыняцце дакумента ў дадзены момант на стадыі завяршэння, паведаміў учора **намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення будаўніцтва і жыллёвай палітыкі — начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр АЎРАМЕНКА.**

«У нас ёсць два ўказы, якія рэгулююць пытанні дзяржаўнай падтрымкі ў жыллёвым будаўніцтве, — гэта ўказы № 13 і № 240. Плануюцца змяненні ў гэтыя ўказы, і цяпер адпаведны праект дакумента практычна зроблены. Напэўна, на гэтым тыдні міністр архітэктуры і будаўніцтва будзе з абмеркаваннем дадзенага дакумента ў Палаце прадстаўнікоў. Гэта значыць, праект указа практычна на стадыі завяршэння, і калі ён будзе канчаткова ўзгоднены, яго перададуць на падпісанне кіраўніку дзяржавы», — удакладніў Аляксандр Аўраменка.

Дык вось, па словах спікера, згаданы дакумент прадугледжвае магчымасць накіравання жыхароў Мінска, якія стаяць у чарзе тых, хто мае патрэбу, на будаўніцтва жылля ў іншыя, менш праблемныя гарады краіны. Больш за тое, будавацца ў іншых гарадах можна будзе з захаваннем чаргі (тэрміну пастаноўкі на ўлік), выдзяленнем субсідый і іншай дзяржпадтрымкай.

Раней намеснік прэм'ер-міністра Анатоль Сівак падчас сумеснага пасяджэння Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі паведамляў, што праект указа аб мерах па аказанні дзяржаўнай падтрымкі прадугледжвае ўрэгуляванне праблемных пытанняў, выяўленых у працэсе практычнай рэалізацыі ўказаў, якія рэгламентуюць пытанні будаўніцтва або набыцця жылых памяшканняў з дзяржаўнай падтрымкай. Паводле яго слоў, праект указа прадугледжвае комплексную карэкціроўку ўказаў № 13 і № 240 і накіраваны на дадатковую абарону інтарэсаў шматдзетных сем'яў, а таксама інтарэсаў членаў сем'яў крэдытаатрымальнікаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Тэхналогіі

# НАСУСТРАЧ БУДУЧЫНІ

## Спецыялісты РУП «Белтэлекам» прадставяць платформу лічбавых камунікацый «Мой горад» на «Вішнёвым фестывалі» ў Глыбокім

**У рамках «Вішнёвага фестывалю», які адбудзецца ў горадзе Глыбокае Віцебскай вобласці 22—24 ліпеня, пройдзе тэматычны дзень «Smart-вішня». У яго праграме — семінар «Разумныя гарады Беларусі — шляхі да развіцця», а таксама выстаўка-прэзентацыя «Касмічныя, авіяцыйныя і інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі для разумных гарадоў (рэгіёнаў)». Адна з самых чаканых падзей фестывалю — прэзентацыя платформы лічбавых камунікацый «Мой горад».**

— Упершыню Міністэрства сувязі і інфарматызацыі сумесна з РУП «Белтэлекам» прадставілі мабільны дадатак «Мой горад» у лютым гэтага года, — распавяла **вядучы спецыяліст аддзела стратэгічнага маркетынгу РУП «Белтэлекам» Наталля ПАДУТА**. — Дадатак алічбоўвае асноўныя гарадскія паслугі для насельніцтва і бізнесу.

Стартавай пляцоўкай праекта ў лютым быў абраны Полацкі рэгіён. Сёння версія пад назвай «Мой Полацк» паспяхова пратэсціравана і стала інструментам камфортнага ўзаемадзеяння жыхароў з гарадской інфраструктурай. На чарзе — Глыбокае.

Рэалізацыя праекта «Разумныя гарады Беларусі» прадугледжвае комплекснае рэгіянальнае развіццё шляхам паслядоўнага і маштабнага ўкаранення і інтэграцыі лічбавых рашэнняў на аснове інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. У хуткім часе будуць рэалізоўвацца праекты ўкаранення лічбавых платформаў разумных гарадоў і рэгіёнаў, якія павінны ахапіць патрэбнасці грамадзян і бізнесу. Мэта праекта «Мой горад» — павышэнне хуткасці і эфектыўнасці ўзаемадзеяння з гарадской экасістэмай пры дапамозе лічбавых тэхналогій.

Праект прадставіць гараджанам сучасны спосаб камунікацыі ў самых розных сферах — ад медыцыны і адукацыі да пакупак і вольнага часу. Дадатак, які будзе прэзентаваны жыхарам Глыбокага ў дні фестывалю і неўзабаве стане часткай штодзённага жыцця глыбачан, аб'яднае ў сабе ўсе гарадскія сэрвісы. Ён дазволіць азнаёміцца з афішай культурных і спартыўных мерапрыемстваў, запісацца на прыём у дзяржаўныя ўстановы, удакладніць рэжым работы кафэ і рэстаранаў, выклікаць майстра з домакіраўніцтва і ўрача з паліклінікі. Усе гарадскія сэрвісы ў дадатку дзеляцца на два блокі: «Арганізацыі» (выканкам, банкі, установы аховы здароўя і адукацыі, спорт, транспарт, ЖКГ і г. д.) і «Адпачынак» (турызм, гандаль, кафэ і г. д.). У дадатку рэалізаваны тры модулі ўзаемадзеяння з карыстальнікам: анлайн-запіс, анлайн-дастаўка, анлайн-аплата. Запіс ва ўстанову, заказ століка, аплата білетаў або дастаўка тавараў — усё гэта неўзабаве стане даступна жыхарам Глыбокага з адной мабільнай праграмай. Рэсурс удалося зрабіць максімальна інфарматыўным, але пры гэтым простым і зручным, падкрэсліла суразмоўніца. Дадатак будзе даступны для ўстаноўкі на Android і iOS.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Новы прэм'ер-міністр Гаіці заняў пасаду



71-гадовы палітык Арыэль Анры, які быў прызначаны прэм'ер-міністрам Гаіці за два дні да гібелі прэзідэнта краіны Жавенэля Маіза, заняў пасаду. Ён заклікаў суграмадзян да дыялогу і паабяцаў актывізаваць расследаванне забойства нацыянальнага лідара. «Краіна перажывае крызісную сітуацыю ва ўсіх сэнсах, мы павінны аднавіць давер і аўтарытэт дзяржавы. Між сектарамі грамадства існуе крайняя палярызацыя, але нам неабходна трывалае рашэнне для гэтага шматбаковага крызісу», — сказаў Анры ў сваім першым звароце да народа. Урад будзе працаваць, прынамсі, да абрання новага кіраўніка дзяржавы. Палітычныя колы Гаіці адмовіліся ад ідэі абрання часовага прэзідэнта на такі тэрмін. Прэзідэнцкія і парламенцкія выбары ў гэтай краіне прызначаны на 26 верасня.

### Тэлефон Макрона маглі праслухоўваць з дапамогай ізраільскай сістэмы Pegasus



Адзін з тэлефонных нумароў прэзідэнта Францыі Эмануэля Макрона быў у спісе мараканскіх спецслужбаў для арганізацыі сачэння з дапамогай ізраільскай сістэмы электроннага шпіянажу Pegasus. Пра гэта паведаміла газета Le Monde. Паводле яе інфармацыі, нумары Макрона, а таксама Эдуара Філіпа, які ўзначальваў урад у 2017–2020 гадах, і 14 міністраў «былі ўключаны ў спіс для магчымага праслухоўвання мараканскімі спецслужбамі». «Калі згаданыя факты пацвердзяцца, то гэта было б вельмі сур'ёзна, — прыводзіць выданне пазіцыю Елісейскага палаца. — Неабходна высветліць сапраўдную карціну ў сувязі з дадзеным выкрыццём». Паводле звестак газеты, нумар тэлефона Макрона быў захаваны аператарам спецслужбаў Марока ў сакавіку 2019 года. Як падкрэслівае Le Monde, занясенне нумара прэзідэнта Францыі ў спіс для праслухоўвання паказвае на ўразлівасць вышэйшай дзяржаўнай улады для падобных электронных нападаў.

### Турэцкія навукоўцы адкрылі 60 новых бактэрый для вытворчасці антыбіётыкаў



Навукоўцы Самсунскага ўніверсітэта адкрылі 60 новых відаў бактэрый. Яны адносяцца ў асноўным да групы акцінабактэрый, з якіх атрымліваюць антыбіётыкі. Пра гэта паведаміў загадчык кафедры малекулярнай біялогіі і генетыкі факультэта мастацтваў і навук гэтага ўніверсітэта, прафесар Неўзат Шахін, паведаміла Haber7. «Адкрытыя віды бактэрый — гэта важны крок і для адкрыцця новых лекаў і антыбіётыкаў», — заявіў Шахін. Турэцкія навукоўцы на працягу двух гадоў даследавалі ўзоры, узятыя з глебы і азёраў на тэрыторыі сваёй краіны, а таксама Туркменіі, Кіпра, Расіі, Нігерыі і Індыі. Выяўленыя арганізмы яны ізалявалі ад натуральнага асяроддзя пражывання: глебы, донных адкладаў, вады, раслінnасці, тканак і каранёў, а пасля ідэнтыфікавалі іх па міжнародных стандартах.

# МУРАЛЫ, РАТОНДА, АБНОЎЛЕНЫ ПАРК...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Праехаўшы 30 кіламетраў з абласнога цэнтра, мы з фотакарэспандэнтам накіраваліся ў афіцыйную частку Скідзеля. **Выконваючы абавязкі старшыні гарадскога выканкама Віктар КЕМЯЖУК** адзначае, што да фестывалю многае зроблена. І мы можам самі ў гэтым упэўніцца.

Праз дарогу цэнтральны гарадскі сквер сустракае жаданай прахаладой. Працуе фантан. Месца адпачынку абнавілася — поўнасцю замянілі тратуарную плітку, устанавілі драўляную альтанку з падсветкай.

Насупраць, побач з будынкам гарвыканкама, модульная сцэна. Тут традыцыйна праходзяць усе знакавыя мерапрыемствы Гродзенскага раёна. Скідзель — культурная сталіца рэгіёна. Адно з апошніх свят, якое тут прайшло, — Дзень моладзі. У мерапрыемствах, як правіла, задзейнічаны і парк. Вакол яго выстаўляюцца гандлёвыя пункты розных прадпрыемстваў і вытворцаў.

Складвалася думка, што і абласныя «Дажынкі» таксама будуць святкавацца на гэтай сцэне. Але для фестывалю абрана іншае месца. І менавіта туды мы едзем з кіраўніком гарадской улады.

Віктар Віктаравіч адразу звяртае ўвагу на дарогі. Зразумела, чаму менавіта дарогі выклікаюць клопат. Яны ў першую чаргу сведчаць аб добраўпарадкаванні населенага пункта. Таму дадзены аспект найперш улічаны пры падрыхтоўцы да абласнога фестывалю. Замена дарожнага палатна адбылася на многіх гарадскіх вуліцах.

Па новым асфальце едзем да будучага месца правядзення свята. Адлегласць ад цэнтра да лакацыі даволі значная. На аўтамабілі дарога займае хвілін дзесяць. Такая расцягнутасць горада склалася з-за ўмоў развіцця прамысловых зон. Акрамя таго, праз горад праходзіць траса М6.

— Спецыфіка Скідзеля такая, што ён мае некалькі частак. Адзін з самых старых раёнаў — каля чыгуначнай станцыі. Раней ён знаходзіўся на адлегласці ад цэнтра, але паступова разбудаваўся і амаль што прымыкае да яго. Ёсць пасёлак бройлернай фабрыкі, ёсць асобны масіў новай жылой забудовы, — растлумачыў Віктар Кемяжук.

А вось раён, куды мы накіроўваемся, — ад цукровага камбіната. Яго будаўніцтва вялося разам з жылым кварталам, дзе засяляліся будаўнікі і работнікі завода. Гэты вытворчы анклаў мае і сваю сацыяльную інфраструктуру, у тым ліку даволі велічны Дом культуры. Менавіта ў ім і плануецца правесці ўрачыстае адкрыццё і ўзнагароджанне перадавікоў сельскай гаспадаркі. Аб'ект капітальна адрамантавалі.

Прыемна ўразіў стары парк. Па словах кіраўніка горада, многім дрэвам, а гэта пераважна клёны, па сто і больш гадоў. Разам з тым, парк выглядае па-сучаснаму. Работы па добраўпарадкаванні вяліся ў рамках падрыхтоўкі да «Дажынак». У выніку з'явіліся новыя газоны, дарожкі, ліхтары і лаўкі. У цэнтры, на месцы былой танцпляцоўкі, устаноўлена белаcнежная ратонда з гербамі раёнаў Гродзенскай вобласці.

Віктар Кемяжук расказвае, што значная ўвага аддавалася вуліцам. Капітальна адрамантавалі Кірава і частку Клубнай. Поўнасцю мадэрнізавана асвятленне, замянілі інжынерна-тэхнічную і дарожную інфраструктуры, з'явіліся веладарожкі, газоны, аўтамабільная стаянка, агароджы. Будынак старога ўнівермага, які не так даўно выкуплены прыватным інвестарам, таксама абновіцца. Ён знаходзіцца якраз у зоне святочных мерапрыемстваў. Парк і клуб — галоўныя лакацыі свята.

— Пакуль канкрэтная дата не вызначана, — паведаміў Віктар Кемяжук. — Вядома толькі, што свята адбудзецца ў верасні. Раней «Дажынкі» праводзіліся ў лістападзе і былі прымеркаваны да прафесійнага свята работнікаў сельскай гаспадаркі і харчавання. Але сёлета вырашылі правесці мерапрыемства раней, падчас спрыяльнага надвор'я і заканчэння жніва. Пайшлі насустрач пажаданням людзей. Гэта добры час для адпачынку.

На шляху ад старога цэнтра горада да мікрараёна цукровага камбіната звяртаюць на сябе ўвагу вялікія муралы на сценах шматпавярховікаў. Большасць з іх — на сельскагаспадарчую тэму. На адным — вялікая выява трактара «Беларус», размешчана яна на будынку сельскагаспадарчага ліцэя. Гэты мурал — своеасаблівая падзяка Мінскаму трактарнаму заводу, які падарыў ліцэю сучасную энерганасычаную тэхніку. Непасрэдна на месцы правядзення фестывалю красуецца маляўнічае пано з дзяўчынай, буслам і полем.

Трэба сказаць, што Скідзелю апошнім часам удзяляецца значная ўвага. Горад у 2014 годзе атрымаў статус спадарожніка Гродна. Гэта прадугледжвае перамяшчэнне сюды вытворчых патокаў, што, у сваю чаргу, пацягне развіццё транспартнай лагістыкі. Напрыклад, пуск электрычкі. Для развіцця бізнесу ў сельскай мясцовасці і малых гарадах маюцца падатковыя льготы тэрмінам на пяць гадоў. Апошняе таксама спрыяе развіццю горада.



Скідзель будуецца ў адпаведнасці з генеральным планам, які распрацаваны 20 гадоў таму. Сёння вядзецца забудова шматпавярховікаў па вуліцы Савецкай. Тут узводзіцца і трохпавярховы дзіцячы садок амаль на 200 месцаў. У планах — здаць яго да канца года. Для горада аб'ект вельмі актуальны, яго ўсе чакаюць. На сённяшні дзень ён вырашыць праблему з уладкаваннем дзяцей у дашкольную ўстанову, бо горад расце. Амаль увесь мікрараён — гэта маладыя сем'і, якія крэдытуюцца на льготных умовах. Пяць шматпавярховікаў на чатыры пад'езды ўжо здадзеныя, да завяршэння мікрараёна плануецца пабудаваць яшчэ два. Усе дамы заселеныя, чарга на жыллё крыху большая за 500 чалавек, таму ёсць неабходнасць працягваць будаўніцтва. У другім мікрараёне па вуліцы Максіма Багдановіча поўным ходам вядзецца будаўніцтва 17 таўнхаусаў.

Новы мікрараён вельмі зручны для пражывання і з пункту гледжання дваровай інфраструктуры. Садок яшчэ будуецца, а вось дзіцячыя пляцоўкі поўнасцю добраўпарадкаваныя. Маецца гульнявы і спартыўны гарадок, які, як выглядае, запатрабаваны ў месцічаў. Такія ж пляцоўкі плануецца ўстанавіць у іншых частках горада. Усе работы вядуцца за кошт раённага бюджэту.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота Яна ХВЕДЧЫНА.**
***г. Скідзель.***

# Водар лаванды вабіць на Веткаўшчыну

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Журналістам, якія любяць браць інтэрв'ю ў харызматычнага фермера, гаспадар лавандавай плантацыі не раз прызнаваўся: маленькая Францыя на Веткаўшчыне апынулася выпадкова. Сам Алег Дабуляк родам з поўначы Малдовы. У Беларусь на пастаяннае месца жыхарства пераехаў у 1999 годзе. Сям'я асвоілася на Веткаўшчыне. У 2010-м вырашылі адкрыць у вёсцы Рудня Споніцкая фермерскую гаспадарку па вырошчванні пладовых культур. Зямлю пад гадавальнік выдзеліла дзяржава. Фермер марыў пра вялікі яблыневы сад, як дома ў Малдове. Але ў першы ж год усе 45 гектараў маладых саджанцаў загінулі... Затое выжыла некалькі кусцікаў лаванды, якія Алег Віктаравіч прывёз з малой радзімы.

— Землі тут пясчаныя, сад на ўчастку не прыжыўся, прапаў. Я яго выкарчаваў і вырашыў паспрабаваць пасадзіць лаванду, — тлумачыць фермер. — Сорт выбраў той, што больш прыстасаваны да паўночных умоў.

Цяперашняя плантацыя нязвыклай для беларускіх шырот культуры займае каля трох гектараў. Па той бок «гарачых» інста-фота з правансім флёрам — дзесяць гадоў карпатлівай працы сям'і Дабуляк.

— З лавандай сур'ёзных складанасцяў ці асаблівасцяў у доглядзе няма. Проста трэба працаваць: своечасова прапалоць, прыбраць пустазелле, — дзеліцца суразмоўнік. — Але мае знаёмыя з заходніх краін, з якімі даводзіцца мець зносіны, кажуць: «Ты вар'ят, калі вырошчваеш лаванду на Беларусі».

Фермер кажа, што гэтая культура нядрэнна зімуе і пры мінус 25, але цяжка пераносіць рэзкія змены тэмператур і моцныя калядныя маразы. Алег Віктаравіч кажа, што яго сэрца баліць, калі пасля зімы кусты вымярзаюць, а рады плантацыі, у якую ўкладвае душу, — радзеюць. Але гаспадар не адчайваецца, а толькі яшчэ больш актыўна бярэцца за работу. Цяперашняя зіма таксама не пашкадавала яго «правансія» палеткі, пасадкі дзе-нідзе парадзелі. І ўсё ж яго лаванда аднаўляецца і сёння працягвае цвісці. Падчас майго візіту ў гадавальнік на плантацыі якраз ідуць праполачныя работы. На маіх вачах работніца бадзёра вызваляе пышныя кусцікі ад пустазелля, рады фіялетавых каласкоў — як намаляваныя. Пытаюся ў жанчыны, як працуецца сярод такога паху. Кажа, вельмі супакойвае.

Дарэчы, лавандавае поле цвіце ўсяго некалькі тыдняў. Многія прыязджаюць сюды менавіта каб атрымаць асалоду ад непаўторнага водару, прайсці скрозь лавандавы гушчар. Прыязджаюць цэлымі сем'ямі. Побач з духмяным полем Алег Дабуляк уладкаваў зону адпачынку. Не невялікія гасцявыя домікі асабліва папулярныя ў фатографаў, якія застаюцца ў гадавальніку нанач, каб зрабіць фота лавандавага раю на світанні. Між іншым, тое, што «Праванс» з веткаўскай «прапіскай» стаў сапраўдным брэндам у сеціве, у многім заслуга дачкі Алега Віктаравіча — Марынелы Дабуляк. Дзяўчына — ландшафтны дызайнер, фларыст — актыўна папулярызуе рамантычны куток на малой радзіме, запрашае на фотасесіі. Здымкі прафесійных фатографаў (публікуюцца ў профілі gomelskii_provans), зробленыя на плантацыі ў Рудне Споніцкай, — сапраўды ўражваюць.



**Духмяны падарунак карэспандэнту «Звязды» ад веткаўскага фермера.**

Летась многія прыязджалі ў гадавальнік і па букеты лаванды. Сёлета пахучыя кусты не стрыгуць на продаж — даюць ім набраць моцы пасля цяжка перанесенай зімы. У планах фермера — істотна павялічыць фіялетавую плантацыю. Ён марыць, што з цягам часу, акрамя прыгожых фота і букетаў, яго лаванда стане яшчэ і сыравінай для вытворчасці натуральнага эфірнага алею.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# ГАЛОДНЫЯ ГУЛЬНІ

## Чаму ва Украіне маштабны недахоп харчавання?



**Дзіцячы фонд ААН (ЮНІСЕФ) апублікаваў даныя за ліпень аб колькасці галадаючых і тых, хто недаядае, у розных краінах свету. Украіна апынулася на адным з апошніх месцаў на кантыненце. Недахоп ежы там адчуваюць 9,8 мільёна чалавек, гэта значыць амаль кожны чацвёрты, улічваючы нават найбольш аптымістычныя ацэнкі колькасці насельніцтва. 1,1 мільёна ўкраінцаў адчуваюць востры недахоп ежы. Прасцей кажучы, гэта ўжо голад. У параўнанні з мінулым годам іх колькасць узрасла на 200 тысяч чалавек. Украіна стала адзінай краінай Усходняй Еўропы, дзе назіраецца значны недахоп харчавання. У той жа час іншыя дзяржавы рэгіёна палепшылі паказчыкі ў дадзенай сферы. Чаму ва Украіне пашыраецца голад?**

### НЕДАЯДАЕ ЧВЭРЦЬ ДЗЯЦЕЙ

Паводле звестак справаздачы ЮНІСЕФ, Украіна лідзіруе ў Еўропе па агульнай колькасці людзей, якім не хапае прадуктаў харчавання. Праблему недаядання правакуе масавае збядненне ўкраінскіх грамадзян. «Паводле даных шматлікіх міжнародных арганізацый, узровень беднасці ва Украіне вырас да 50 працэнтаў, за мяжой беднасці знаходзіцца каля 19 мільёнаў украінцаў», — канстатавала віцэ-спікер Вярхоўнай Рады Алена Кандрацюк, прызнаючы, што беднасць набыла ва Украіне па-сапраўднаму сістэмны характар.



Каментуючы паведамленні аб недаяданні ўкраінцаў, прадстаўнікі «Слугі народа» намагаюцца паказаць гэта глабальнай праблемай, якая праяўляе сябе літаральна паўсюль, і абвінавачваюць у ёй COVID-19. Як адзначаюць эксперты, гэта хутчэй адгаворкі, бо сітуацыя насамрэч вельмі складаная і вымагае неадкладных мер. Асабліва палохае тое, што сярод украінскіх дзяцей ва ўзросце да пяці гадоў у амаль чвэрці — 23 працэнтаў — адзначаецца хранічнае недаяданне, а ў 8,2 % — вострае недаяданне. 21,3 % малых з-за недаядання адставалі ў росце, 6,9 % пакутавалі ад знясілення, а 5,6 % — ад залішняй вагі, што таксама звязана з няякасным харчаваннем.

Эксперты Украінскай збожжавай асацыяцыі, Асацыяцыі хімікаў Украіны, Асацыяцыі «Укрмаслапрам», Федэрацыі металургаў Украіны і Эканамічнага дыскусійнага клуба падлічылі, што да 2019 года сярэднясутачная пажыўнасць рацыёну грамадзян Украіны знізілася да 2700 ккал, што вельмі блізка да гранічна дапушчальнага індыкатару здаровага спосабу жыцця ў 2500 ккал. Малака насельніцтва краіны спажывае толькі 52 працэнты ад нормы, рыбных прадуктаў — 59 %, мясных прадуктаў — 66%, садавіны — 64 %. Каларыйнасць на мяжы нормы набіраецца перш за ўсё за кошт прадукцыі раслінаводства: хлеба, бульбы, гароднiны, алею. Хоць, як сведчаць вынікі даследавання міжнароднай кампаніі Ipsos, якое было праведзена па ініцыятыве Danone, дарослыя грамадзяне Украіны спажываюць амаль удвая менш гароднiны ў параўнанні з рэкамендаванай нормай, затое бульбы ў рацыёне становіцца ўсё больш (135,7 кг у 2019-м супраць 128,9 кг у 2010-м). Мучных вырабаў з'ядаюць празмерна, але ўсё роўна менш, чым раней (97,6 кг у 2019-м супраць 111,3 кг у 2010-м). Знізілася спажыванне цукру, малака, яек, рыбы, алею. У Асацыяцыі жывёлаводаў Украіны заявілі, што за апошнія пяць гадоў спажыванне мяса на душу насельніцтва зменшылася больш чым на 30 працэнтаў. З і так недастатковай колькасці мясных прадуктаў прыкладна 20 % прыпадае на каўбасу і сасіскі сумніўнай якасці.

За прыкладамі далёка хадзіць не трэба. Дзяржстат сцвярджае, што летась вытворчасць мяса ва Украіне скарацілася на 1,1 працэнта, а імпарт свініны перавысіў экспарт у шэсць разоў! Па выніках 2019 — 2020 гг. Мінсельгас ЗША заявіў, што Украіна стала другім буйнейшым у свеце экспарцёрам ячменю, чацвёртым — кукурузы і пятым — пшаніцы. Той жа пшаніцы Украіна вывезла 21,1 млн тон. А ўвезла (з мінулагодняга ліпеня да сёлетняга студзеня) 14,5 тыс. тон — у сем разоў больш, чым у папярэднім сезоне.

Нягледзячы на рызыкі, звязаныя з каранавірусам, на заклікі Усеўкраінскай асацыяцыі пекараў і асацыяцыі «Мукамолы краіны» абмежаваць экспарт збожжавых, урад гэтага не зрабіў. Прытым летась за першае паўгоддзе толькі ў адным Еўрасаюзе Украіна закупіла сельгаспрадукцыі амаль на 1,6 мільярда долараў. Галоўныя пастаўшчыкі — Польшча, Германія, Турцыя, Італія і ЗША.

### НЕ ХАПАЕ ЗАРПЛАТЫ

Украіна летась заняла 54-е месца ў Глабальным індэксе харчовай бяспекі (GFSI). Гэты комплексны індыкатар ацэньвае наяўнасць, даступнасць і якасць неабходных прадуктаў. Адзначаецца, што невысокі рэйтынг краіны — вынік адсутнасці дзяржаўных абавязацельстваў па доступе насельніцтва да харчавання. Ежы ў крамах поўна, і прадаецца яна не па картках. Такім чынам, праблема заключаецца ў недахопе сродкаў для яе набыцця. І сапраўды, згодна з даследаваннем Кіеўскага міжнароднага інстытута сацыялогіі, фінансавы стан 54,4 працэнта ўкраінскіх сем'яў за апошнія два гады пагоршыўся. Прычына — рост камунальных тарыфаў (91,5 працэнта апытаных), павышэнне цэн на прадукты харчавання (90,6 %), зніжэнне даходаў (35,4 %), страта работы (31,9 %). Штомесячныя выдаткі сярэднестатыстычнай украінскай дамашняй гаспадаркі на ежу перавышаюць палову сямейнага бюджэту. Аднак для паўнавартаснага харчавання не хапае нават гэтага.

Як заўважыла кіраўнік Інстытута дэмаграфіі і сацыяльных даследаванняў імя Міхаіла Птухі акадэмік Эла Лібанава, ужо на пачатак 2020 года больш за палову ўкраінцаў апынулася за мяжой беднасці (51 %). Прычым, як падкрэсліла эксперт, большасць з гэтых людзей працуе. Адпаведную праблему ўздымала і амбудсмен Украіны. «Паводле ацэнак экспертаў, кожнаму трэціму працуючаму не хапае заработнай платы на задавальненне неабходных жыццёвых патрэб, а кожны другі працаздольны працуе на ўмовах другаснай занятасці», — адзначыла амбудсмен Людміла Дзянісава на Сацыяльным форуме Савета ААН. Прасцей кажучы, яна пацвярджае, што многія ўкраінцы працуюць нават на дзвюх работах, але ўсё роўна не могуць пракарміцца.

У адпаведнасці з мэтамі ААН Украіна абавязалася скараціць узровень беднасці да 2030 года ў чатыры разы. Яшчэ ў сакавіку 2016-га была распрацавана Стратэгія барацьбы з беднасцю, якую падпісаў тагачасны прэм'ер-міністр Арсеній Яцанюк. Найважнейшую сацыяльную праблему меркавалася вырашыць за наступныя пяць гадоў (гэта значыць да 2021-га), але ўсё завяршылася фактычна павелічэннем колькасці бедных. Свой варыянт прапанаваў прэзідэнт Украіны. На думку Уладзіміра Зяленскага, каб не было бедных, трэба максімальна дэрэгуляваць эканоміку, гэта значыць адпусціць у свабоднае плаванне ўсе цэны і тарыфы, а таксама спагнаць падаткі з грамадзян. Як той казаў, каментарыі тут залішнія. Яшчэ больш адарванымі ад народа з'яўляюцца такія палітыкі, як колішняя в. а. міністра аховы здароўя Ульяна Супрун. У свой час украінцы не ацанілі яе «слушную» параду адмовіцца ад чорнай ікры і пераходзіць на ікру чырвоную дзеля правільнага харчавання і выратавання папуляцый асятровых.

Найбольшы працэнт сярод тых, хто недаядае, і тых, хто жыве за мяжой беднасці, — сярод украінскіх пенсіянераў. Такіх, паводле ацэнак Людмілы Дзянісавай, каля 80 працэнтаў. Яшчэ адна сацыяльна неабароненая катэгорыя насельніцтва — маці-адзіночкі, працэнт якіх у краіне пастаянна павялічваецца. Аднак і паўнавартасныя сем'і часта не могуць пракарміць сваіх дзяцей. «Двое працуючых бацькоў не ў стане цалкам забяспечыць дваіх дзяцей нават па нізкіх украінскіх стандартах спажывання. Нараджэнне другога дзіцяці стварае вельмі сур'ёзную рызыку збяднення, а шматдзетныя сем'і амаль усе маюць патрэбу», — адзначыла Эла Лібанава. Натуральна, недаяданне ўплывае на агульны стан здароўя і імунная сістэмы чалавека, павялічваючы рызыку смерці ад любых захворванняў, уключаючы COVID-19.

### ДРУГОЕ ВЫДАННЕ ДЗЕВЯНОСТЫХ

За год цэны на цукар, яйкі і сланечнікавы алей ва Украіне выраслі ў сярэднім на 80 працэнтаў. Цукар цяпер каштуе значна даражэй, чым на сусветных рынках, хоць краіна традыцыйна з'яўляецца адным з асноўных яго вытворцаў. У пачатку ліпеня асацыяцыі вытворцаў харчовых прадуктаў звярнуліся да прэзідэнта Украіны з-за «пагрозлівай сітуацыі на рынку цукру». Яны адзначылі, што ўнутраныя цэны на гэты важны прадукт рацыёну «амаль удвая вышэйшыя, чым на Лонданскай біржы».

Кіраўнік парламенцкага Камітэта па пытаннях фінансаў, падатковай і мытнай палітыкі Данііл Гетманцаў лічыць той факт, што цукар ва Украіне самы дарагі на еўрапейскім кантыненце, вынікам змовы з мэтай атрымання звышпрыбыткаў. «Як чалавек, які можа чытаць лічбы, я магу казаць пра тое, што ёсць нейкія прыкметы пэўнай змовы, прытрымлівання тавару з мэтай атрымання дадатковых заробкаў», — заявіў Гетманцаў.

Як аказалася, кошт украінскай прадукцыі ў Чэхіі і Польшчы значна меншы, чым у самой Украіне. Пры гэтым тут таксама ўлічваюцца перавозка, пакрыццё закупачнай цаны і нацэнка крамы. З усімі «накруткамі» атрымліваецца, што кошт сланечнікавага алею ў Чэхіі ў два разы меншы. Такая ж сітуацыя і з іншымі прадуктамі. Грамадская арганізацыя «Эканамічны дыскусійны клуб» праводзіла параўнанне цэн у Польшчы і ва Украіне. Па даных даследавання, розніца складае 60 — 100 працэнтаў, паведаміла выданне ukrainianwall.com.

Адметна, што ўсё гэта адбываецца на фоне зямельнай рэформы. З 1 ліпеня ва Украіне дазволена прадаваць сельскагаспадарчыя ўгоддзі. Лідар партыі «Бацькаўшчына» Юлія Цімашэнка папярэджвае, што ўкраінская дзяржава страціць кантроль над большай часткай сельгасугоддзяў, а па словах былога міністра эканомікі Віктара Суслава, аграрны сектар трапіць у рукі замежных кампаній, што паставіць пад пагрозу харчовую бяспеку Украіны.

Зрэшты падобнае адбывалася яшчэ да зняцця мараторыя на продаж зямлі. Ва Украіне перасталі ажыццяўляць прагназаванне ўраджаю, не вядуць неабходны падлік харчовых запасаў, а дзяржава цалкам адпусціла цэнаўтварэнне, зусім не лічыцца з рэальнымі патрэбамі і пакупніцкай здольнасцю насельніцтва. Што адкрывае шырокія магчымасці для маніпулявання цэнамі. Такая сітуацыя вельмі выгадная транснацыянальным кампаніям і стымулюе збядненне ўкраінцаў. Продаж зямлі яшчэ больш пагоршыць крызіс. Нягледзячы на тое, што яе нельга набываць замежнікам, замежныя карпарацыі змогуць скупляць асноўныя зямельныя актывы праз сваіх украінскіх прадстаўнікоў, з дапамогай банкаў або падстаўных асоб. Пасля чаго сарыентуюць іх на вырошчванне ўсё тых жа экспартных культур, абсалютна не зважаючы на харчовыя патрэбы Украіны.

Такая схема даўно апрабаваная на краінах трэцяга свету і з'яўляецца характэрнай прыкметай каланіяльнай залежнасці, у якую трапіла сучасная ўкраінская дзяржава, адзначыў vz.ru. Аднак страта харчовай бяспекі — не адзіная праблема. Зямельная прыватызацыя будзе ўяўляць з сябе ў гэтых умовах другое выданне дзевяностых, калі бандыты захоплівалі заводы і адбіралі ў людзей жыллё ў вялікіх гарадах. Людзі ў камуфляжы без праблем прымусяць сялян перапісаць на іх участкі зямлі, таму што абараніць тых проста няма каму. А многія ўкраінцы добраахвотна прададуць сваю зямлю па заведама заніжаных цэнах, якія ўстановяць па змове паміж сабою скупшчыкі, — толькі для таго, каб падтрымаць сябе ва ўмовах хранічнага беспрацоўя.

«Эпоха беднасці скончылася, пачалася эпоха голаду і галечы», — адзначыў дэпутат Вярхоўнай Рады Украіны ад партыі «Апазіцыйная платформа — За жыццё» Ілья Ківа ў сваім Telegram-канале. Былы дэпутат Вярхоўнай Рады Украіны Яўген Мураеў выказаў здагадку, што моцны крызіс у краіне можа прывесці да яе распаду. Пра гэта ён заявіў у эфіры канала «Наш». Ва Украіне паглыбляецца бюджэтны крызіс, крызіс у медыцыне і адукацыі, «набліжаецца крызіс у энергетыцы», адзначыў Мураеў. Пры гэтым ён абвінаваціў кіруючую партыю ў пагаршэнні бягучага становішча і папярэдзіў, што калі сітуацыя ва Украіне не стабілізуецца, то праз некалькі месяцаў краіну могуць ахапіць масавыя вулічныя пратэсты.

**Пётр ДУНЬКО.**

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| Продавец | **ОАО «БЕЛХИМ», Минская обл., Дзержинский р-н, Фанипольский, с/с 19** |
| **Предмет аукциона** | |
| Наименование | Начальная цена с НДС 20 % |
| **Производственный цех** (производственное помещение) общей площадью 1 666,1 кв. м, инв. номер 620/D-25595, по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 25Б-2 | **863 416,80** бел. руб. |

**Обременение: аренда.** С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Задаток 5 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в ОАО «Белинвестбанк» (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 60 календарных дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 24.08.2021 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703.**

**Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 20.08.2021 до 17.00 по указанному адресу**

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**



Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| Продавец | **ГЛХУ «Бобруйский лесхоз», Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Орджоникидзе, 99-к** |

**Предмет аукциона: транспортные средства, бывшие в употреблении. Месторасположение: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Орджоникидзе, 99-к**

| Лот № | Инв. номер | Наименование | Начальная цена, (с НДС 20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 01200700 | **Автомобиль грузовой специальный сортиментовоз МАЗ 6303А8 с гидроманипулятором**, рег. знак AI 6326-6, 2010 г. в. | 56 280,00 |
| | 01200701 | **Прицеп специальный сортиментовоз МАЗ 837810-022**, рег. знак 5190 AA-6, 2010 г. в. | |

**Порядок осмотра:** по предварительному согласованию в рабочие дни +375 44 741 26 30, Лапыров Владимир Иванович

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390. **Срок внесения задатка по 20.08.2021**

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров РБ от 12 июля 2013 г. № 609 (далее – Положение)

Извещение о проведении торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу (http://gki.gov.by/ru/) **22.07.2021**. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте cpo.by

**Дата и время проведения аукциона: 24.08.2021 в 13.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».

**Дата и время окончания приема документов: 20.08.2021 до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Контактные телефоны:** +375 (17) 280-36-37; +375 (44) 704-92-06. **E-mail:** auction@cpo.by



**Могилевский филиал**

**РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**информирует о проведении 06.08.2021 повторного аукциона по продаже имущества ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)**

**Лот № 1: изолированное помещение с инв. № 700/D-85447 – нежилое изолированное помещение**, общ. пл. 1478,4 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Белинского, 3. **Изолированное помещение с инв. № 700/D-85854 – изолированное помещение образовательного, воспитательного и научного назначения**, общ. пл. 744,9 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Белинского, 3-2. **Изолированное помещение с инв. № 700/D-85857 – бомбоубежище**, общ. пл. 184,9 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Белинского, 3. **Изолированное помещение с инв. № 700/D-85450 – нежилое изолированное помещение**, общ. пл 42,3 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Белинского, 3. Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 740100000002000531 (площадь – 1,0722 га, право постоянного пользования, доля в праве 197/1000). Отдельный земельный участок для обслуживания лота № 1 не выделен. Обременение: аренда.

***Начальная цена продажи: 941 109.92 бел. руб. с учетом НДС.***

**Аукцион состоится 06 августа 2021 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона ino.by.

Организатор аукциона: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, +37529-550-09-56** и на сайте **ino.by**


ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «Опять двадцать пять. 5 тур»

Настоящие правила проведения рекламной игры «Опять двадцать пять. 5 тур» (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003. № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Опять двадцать пять. 5 тур» (далее – Рекламная игра), проводимой в целях стимулирования реализации топлива (АИ-92, АИ-95, ДТ-Евро), сопутствующих товаров (кроме табачных изделий, алкогольных и слабоалкогольных напитков, пива) среди прошедших регистрацию обладателей карты-брелока программы благодарности «Дзякуй» ОДО «Астотрейдинг».

**1. Организатор Рекламной игры**

Организатором Рекламной игры является общество с дополнительной ответственностью «Астотрейдинг» (ОДО «Астотрейдинг»), расположенное по адресу: 220125, г. Минск, ул. Гинтовта, 1, пом. 9.

Юридический адрес ОДО «Астотрейдинг»: 223053, Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Боровая, дом 7, административные помещения, кабинет 24; УНП 690362737; E-mail: a-100@a-100.by

**2. Наименование Рекламной игры**

Рекламная игра носит название: «Опять двадцать пять. 5 тур»

**3. Участники Рекламной игры**

В Рекламной игре могут принять участие дееспособные физические лица, проживающие на территории Республики Беларусь в период проведения Рекламной игры, граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, постоянно проживающие в Республике Беларусь и имеющие вид на жительство в Республике Беларусь, прошедшие регистрацию обладателя карты-брелока программы благодарности «Дзякуй» ОДО «Астотрейдинг».

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

**4. Права участников Рекламной игры**

Участник Рекламной игры имеет право: знакомиться с Правилами Рекламной игры, принимать участие в Рекламной игре на условиях, определенных настоящими Правилами.

Каждый Участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное количество раз при выполнении условий Рекламной игры.

**5. Сроки проведения Рекламной игры**

Начало Рекламной игры: 23 июля 2021 года.

Окончание Рекламной игры: 06 августа 2021 года (включая период проведения розыгрыша, выдачи призов, опубликования результатов Рекламной игры).

**6. Территория проведения Рекламной игры**

Автозаправочные станции ОДО «Астотрейдинг» (далее – АЗС ОДО «Астотрейдинг»), размещенные в г. Минске, Минской области, г. Бресте, Брестской области согласно таблице № 1 ниже:

Таблица № 1. Адреса объектов.

| Номер АЗС | Адрес |
|---|---|
| АЗС № 1 | г. Минск, ул. Пригородная, 69 |
| АЗС № 2 | Минский р-н, д. Боровая, 7 |
| АЗС № 5 | г. Минск, ул. Масюковщина, 2а, корп. 3 |
| АЗС № 6 | г. Минск, ул. Харьковская, 81 |
| АЗС № 7 | г. Минск, пр-т Партизанский, 8а |
| АЗС № 11 | г. Минск, ул. Машиностроителей, 7Б |
| АЗС № 12 | г. Минск, ул. Притыцкого, 62В |
| АЗС № 13 | г. Минск, ул. Радиальная, 13 А |
| АЗС № 15 | г. Минск, ул. Промышленная, 2 Б (МКАД) |
| АЗС № 16 | г. Минск, ул. Казинца, 133 |
| АЗС № 17 | г. Минск, ул. Некрасова, 41 |
| АЗС № 18 | Минский район, Новодворский с/с, М4, 15 км, 2 (д. Ельница) |
| АЗС № 19 | г. Минск, ул. Брикета, 23 (МКАД) |
| АЗС № 20 | г. Минск, Долгиновский тракт, 190 (МКАД) |
| АЗС № 21 | г. Минск, ул. Ваупшасова, 40 |
| АЗС № 22 | Минская обл., Смолевический р-н, автодорога Минск-Брест-граница РФ, км. 388 (право) |
| АЗС № 23 | г. Минск, Казимировская, 39 |
| АЗС № 24 | Минский р-н, Щомыслицкий с/с, Р 1 |
| АЗС № 25 | Минский р-н, аг. Сеница, ул. Зеленая, 1/4 |
| АЗС № 26 | г. Брест ул. 28 июля, 50 |
| АЗС № 27 | г. Брест ул. Радужная, 20 |
| АЗС № 28 | г. Брест, пр. Республики, 6 |
| АЗС № 29 | г. Брест, ул. Я. Купалы, 106/4 |
| АЗС № 30 | г. Минск, ул. Аннаева, 47 |
| АЗС № 31 | г. Минск, ул. Академическая, 34 |
| АЗС № 32 | Брестская область, Малоритский район, Мокранский с/с, агр. Мокраны, ул. Брестская |
| АЗС № 35 | Минский р-н, Новодворский с/с, 82 |

**7. Наименование товаров/услуг, в целях стимулирования которых проводится Рекламная игра**

Рекламная игра проводится в целях стимулирования реализации топлива (АИ-92, АИ-95, ДТ-Евро), сопутствующих товаров (кроме табачных изделий, алкогольных и слабоалкогольных напитков, пива) среди прошедших регистрацию обладателей карты-брелока программы благодарности «Дзякуй» ОДО «Астотрейдинг».

**8. Призовой фонд Рекламной игры**

8.1. Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет денежных средств Организатора в размере 1143,70 (Одна тысяча сто сорок три белорусских рубля, 70 копеек).

Призовой фонд Рекламной игры включает следующие призы:

Таблица № 2. Призовой фонд Рекламной игры.

| № п/п | Наименование приза | Количество | Стоимость за единицу, бел. руб. | Общая стоимость, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Топливные талоны на 100 литров топлива АИ-95 и/или ДТ-Евро | 5 | 199,00 | 995,00 |
| | Денежные средства для уплаты подоходного налога | 5 | 29,74 | 148,70 |
| | **Всего призовой фонд, бел. руб.:** | | | **1143,70** |

**9. Порядок участия в Рекламной игре**

9.1. Для участия в Рекламной игре необходимо выполнить условия допуска к розыгрышу призового фонда.

9.2. Один шанс на участие в Рекламной игре зачисляется в случае покупки от 25 литров топлива (АИ-92 и/или АИ-95, и/или ДТ-Евро) и покупки сопутствующих товаров (кроме табачных изделий, алкогольных и слабоалкогольных напитков, пива) на сумму от 5,00 (пяти) белорусских рублей в одном чеке с использованием зарегистрированной карты-брелока программы благодарности «Дзякуй» ОДО «Астотрейдинг» на любой АЗС ОДО «Астотрейдинг» согласно п. 6 настоящих Правил.

Количество шансов у одного участника не ограничено, но должно быть не менее одного. При зачислении шанса суммы покупок сопутствующих товаров и объемы приобретенных литров топлива не округляются. Зачисление шансов производится по фактически целым числам (кратно 25 (двадцати пяти) литрам топлива (АИ-92 и/или АИ-95, и/или ДТ-Евро) и кратно приобретенным сопутствующим товарам на сумму 5,00 (пять) белорусских рублей).

Количество шансов рассчитывается исходя из объема литров покупки топлива (АИ-92 и/или АИ-95, и/или ДТ-Евро) и суммы покупок сопутствующих товаров (кроме табачных изделий, алкогольных и слабоалкогольных напитков, пива) в одном чеке за период с 00:00:00 23.07.2021 по 23:59:59 29.07.2021.

9.3. В Рекламной игре принимают участие только зарегистрированные обладатели (владельцы) карты-брелока программы благодарности «Дзякуй» ОДО «Астотрейдинг», осуществившие регистрацию до выполнения условий, необходимых для участия в Рекламной игре (согласно подпунктам 9.1.- 9.2.).

Зарегистрировать Брелок необходимо через личный кабинет, ссылка на который расположена на главной странице официального сайта Организатора по адресу http://azs.a-100.by/.

Для регистрации необходимо:

заполнить все обязательные поля в анкете (помеченные символом * (звездочка), а именно: фамилия, имя, отчество, пол, дата рождения, адрес электронной почты, номер мобильного телефона, адрес проживания;

получить на указанный пользователем в анкете номер телефона код активации, ввести его в личном кабинете.

9.4. Участник Рекламной игры принимает участие в розыгрыше приза согласно таблице № 3 п.10. настоящих Правил Рекламной игры.

9.5. В розыгрыше призового фонда принимают участие только лица, выполнившие требования настоящих Правил.

**10. Порядок проведения розыгрыша призового фонда**

Призовой фонд разыгрывается в порядке и в соответствии с условиями, указанными в таблице № 3.

Таблица № 3. Розыгрыш призового фонда.

| Участвуют участники Рекламной игры, выполнившие условия Рекламной игры согласно Правилам Рекламной игры | Дата и время розыгрыша | Место розыгрыша | Призы для розыгрыша |
|---|---|---|---|
| с 00:00:00 23.07.2021 по 23:59:59 29.07.2021 | 30.07.2021 в 17.00 | Минская область, Минский район, д. Боровая, 7, на АЗС № 2 ОДО «Астотрейдинг» | Приз топливные талоны на 100 литров топлива АИ-95 и/или ДТ-Евро – 5 шт. |

**11. Механика розыгрыша призового фонда Рекламной игры. Определение победителя Рекламной игры. Информирование победителей.**

11.1. Для проведения розыгрыша формируется список Участников Рекламной игры, выполнивших условия Рекламной игры, описанные в п. 9 настоящих правил и имеющих минимум 1 шанс.

11.2. Список Участников Рекламной игры состоит из следующих полей:

порядковый Игровой номер Участника Рекламной игры, который присваивается по ФИО Участника Рекламной игры в алфавитном порядке, в следующей очередности, с учетом выбранного языка при заполнении информации при регистрации: русский язык, транслит на латинице;

порядковый Игровой номер назначается на каждый шанс Участника Рекламной Игры;

ФИО Участника Рекламной игры;

порядковый номер карты-брелока программы благодарности «Дзякуй» ОДО «Астотрейдинг».

Для проведения розыгрыша используется лототрон и один набор предметов в количестве 10 штук с номерами от 0 до 9. Определение победителя производится посредством определения выигравшего порядкового Игрового номера участника Рекламной игры.

Определение выигрышного порядкового Игрового номера происходит путем их формирования слева направо из номеров предметов, поочередно извлекаемых из лототрона. Розыгрыш начинается с первого разряда слева.

Первый разряд порядкового Игрового номера участника Рекламной игры определяется следующим путем: в лототрон Организатором загружаются предметы с номерами от 0 по цифру, соответствующую первому разряду последнего порядкового Игрового номера участника Рекламной игры. Предметы перемешиваются и из лототрона извлекается предмет, номер которого определяет цифру первого разряда выигрышного порядкового Игрового номера участника Рекламной игры. Номер предмета вносится в протокол. Далее в лототрон повторно загружается один набор предметов в количестве 10 штук с номерами, которые существуют по сверенному списку порядкового Игрового номера участников Рекламной игры в соответствующем разряде. Предметы перемешиваются и из лототрона извлекается предмет, номер которого определяет цифру соответствующего разряда выигрышного порядкового Игрового номера участника Рекламной игры. Номер предмета вносится в протокол.

Для определения последующих разрядов выполняются те же действия. Номера предметов вносятся последовательно в протокол, тем самым определяется выигрышный порядковый Игровой номер.

11.3. Итоги розыгрыша призового фонда Рекламной игры фиксируются в Протоколе комиссии, который составляется и подписывается присутствующими членами комиссии.

11.4. Участники Рекламной игры вправе ознакомиться с результатами розыгрыша на официальном сайте компании по ссылке: http://azs.a-100.by/company/news.

Результаты розыгрыша будут опубликованы на сайте в день розыгрыша до 21:00.

11.5. После проведения розыгрыша Победителя Рекламной игры извещают о выигрыше путем уведомления по электронной почте или звонком по номеру телефону указанными при регистрации Брелока. Организатор оставляет за собой право дополнительно уведомить Победителя любым удобным ему способом: посредством СМС-сообщения на указанный в личном кабинете номер телефона при регистрации Брелока, сообщением в личном кабинете участника программы благодарности «Дзякуй» в срок не позднее 31.07.2021.

**12. Порядок выдачи приза:**

12.1. Выдача призов победителям розыгрыша Рекламной игры осуществляется в срок не позднее 06.08.2021 путем выдачи топливных талонов на 100 литров топлива АИ-95 номиналом 10 литров и/или ДТ-Евро номиналом 5 литров по ведомости выдачи призов с указанием ФИО победителя, паспортных данных.

Срок действия топливных талонов – 1 месяц со дня проведения розыгрыша.

Приз не подлежит возврату. Выплата денежного эквивалента стоимости приза не допускается. Срок действия получения и использования приза не продлевается.

12.2. В случае отказа Победителя Рекламной игры от получения приза, неполучения приза в установленном Правилами порядке и сроки, либо невыполнение условий их получения, приз остается у Организатора и используются по усмотрению Организатора.

12.3. Ответственность Организатора по выдаче приза ограничена исключительно Призовым фондом, указанным в п. 8.1 настоящих Правил.

12.4. Организатор не оплачивает Участникам расходы, связанные с проездом к месту розыгрыша, а также к месту получения приза.

12.5. Факт участия в Рекламной игре подразумевает, что ее Участники соглашаются с настоящими Правилами, в том числе условиями выдачи приза, а также с тем, что в рамках Рекламной игры их фамилии, имена, отчества, фотографии, интервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором. Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Рекламной игре, в том числе по радио, телевидению, в Интернете, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения.

Все права на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

**13. Состав Комиссии по проведению Рекламной игры**

Для проведения Рекламной игры, контроля за соблюдением Правил Рекламной игры, утверждения результатов, подведения итогов по результатам проведения розыгрыша Организатором создается комиссия по ее проведению в следующем составе:

1. Заместитель директора по маркетингу и развитию ОДО «Астотрейдинг» Сойнов Василий Андреевич.

2. Заместитель директора по идеологическим вопросам ОДО «Астотрейдинг» Карпук Василий Владимирович.

3. Начальник контрольно-ревизионной службы ОДО «Астотрейдинг» Короткий Дмитрий Иванович.

4. Начальник юридического отдела ОДО «Астотрейдинг» Северина Виктория Валерьевна.

5. Заведующий нефтескладом ООО «БигОйлЦентр» Набеда Андрей Евгеньевич.

**14. Информация о Рекламной игре, публикация Правил Рекламной игры**

Правила Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» до начала проведения Рекламной игры.

Результаты Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» не позднее 06.08.2021.

Дополнительно информацию о Рекламной игре можно получить на Интернет сайте Организатора: http://azs.a-100.by

Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить по телефону +375 17 2333333 или на сайте Организатора http://azs.a-100.by

**15. Прочие условия**

Споры между Организатором Рекламной Игры и Участниками Рекламной Игры рассматриваются согласно действующему законодательству Республики Беларусь.

*Свидетельство № 4040 о государственной регистрации Рекламной игры, зарегистрированной 16.07.2021 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

22 ЛІПЕНЯ 2021 г.
ЧАЦВЕР
№ 14 (15913)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Полі КАНАБІС:

# «НЕ ВАРТА НАВЯЗВАЦЬ СВАЕ ЎЯЎЛЕННІ АБ ПРЫГАЖОСЦІ»

**Індустрыя моды — цікавы і адначасова складаны свет, дзе недастаткова мець толькі прывабную знешнасць. Тая ж прафесія мадэлі часта асацыюецца выключна з подыумам, сафітамі, здымкамі для часопісаў і вялікімі заробкамі. Ці так гэта насамрэч? Пра закулiссе і перспектывы ў дадзенай сферы «Чырвонка. Чырвоная змена» паспрабавала даведацца ва ўдзельніцы шматлікіх конкурсаў прыгажосці Полі Канабіс. Яна — добры прыклад таго, што можна зрабіць сябе насуперак усім, калі верыць, мець розум і ведаць, чаго па-сапраўднаму жадаеш.**




***— «Свет уратуецца прыгажосцю», — сказаў некалі класік. Калі перанесці пасыл на рэальнае жыццё, то як гэта працуе? І што вас матывуе на ўдзел у разнастайных конкурсах?***

— Мой самы галоўны матыў — годна прадставіць краіну, таму што мне хочацца, каб людзі ганарыліся тым, што яны беларусы. Хачу, каб за дзяржаву выступалі менавіта нашы дзяўчата, а не мадэлі з іншых краін, бо ў нас вельмі шмат прыгажунь. Таксама мяне матывуе і імкненне распавесці, што такое конкурсы, таму што яны не толькі аб прыгажосці. Зразумела, дзяўчына павінна быць з цікавай і прыемнай знешнасцю, але ж гэта далёка не галоўнае. Кастынг мы праходзім на этапе перад тым, як трапляем на само спаборніцтва. А там цябе ўжо ацэньваюць зусім па іншых характарыстыках, напрыклад, па ўменні паводзіць сябе з іншымі людзьмі, бо мае значэнне не толькі тваё стаўленне да суддзяў, але і да астатніх канкурсантак, нават да пакаёўкі ў гатэлі. Важна, які прыклад ты падаеш іншым. Пасля, калі ты перамагаеш і атрымліваеш карону, то з ёй прыходзіць і вялікая адказнасць. Ты павінна адпавядаць мностве крытэрыяў, натхняць і матываваць іншых людзей змяняцца да лепшага і змяняць свет вакол сябе.

***— Ведаю, што конкурсы прыгажосці таксама маюць пэўныя сацыяльныя пасылы. На што вы арыентуецеся, выбіраючы чарговы для ўдзелу?***

— Гэты момант для мяне вельмі важны. Трэба ўлічваць і тое, які тып каралевы шукаюць. Бо на адным конкурсе чакаюць дзяўчыну, якая ўмее пранікнуцца чужымі праблемамі, паколькі ёсць сацыяльная скіраванасць, а значыць, будзе шмат дабрачынных мерапрыемстваў, паездак у дамы састарэлых, дамы-інтэрнаты і г. д. У другім патрэбна такая канкурсантка, якая проста будзе зззяць на сцэне і ніхто не зможа адвесці ад яе вачэй. Іншымі словамі, гэта ўжо арыентацыя на іншы тыпаж. Першая наўрад ці пераможа ў другім конкурсе, як і наадварот. Калі казаць пра сацыяльную скіраванасць, то для ўдзельніц гэта магчымасць даведацца шмат цікавага. Вось займаецца хтосьці ахавай навакольнага асяроддзя, але не мае ўяўлення, як спыніць вайну ва ўсім свеце, а калі трапляе на конкурс, то можа набыць новыя веды па тым кірунку, у якім зацікаўлены. Пасля гэтага можа выліцца нават у нейкія праекты ў сваёй краіне. Глядзіце, тая ж тэма экалогіі не ўспрымалася мною блізка і маштабна да моманту ўдзелу ў конкурсе «Міс Зямля». Але ў працэсе падрыхтоўкі да яго нам трэба было на працягу месяца кожны дзень рэалізоўваць нейкае дзеянне, звязанае з аховай навакольнага асяроддзя. За гэты час я памяняла ўсе лямпачкі напальвання ў сябе і ў сяброў дома на энергазберагальныя, стала сартаваць смецце асобна, арганізавала збор батарэек у пад'ездзе. Бо яны вельмі шкодныя, напрыклад, адна забруджвае два кубаметры зямлі і забівае дваццаць тысяч дажджавых чарвякоў, двух вожыкаў. Таксама мы садзілі дрэвы, ездзілі на смеццеперапрацоўчы завод. Пасля конкурсу карысныя звычкі засталіся ў маім жыцці.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

Нясумныя канікулы

# У пошуках спадчыны, што знікае

**1 ліпеня з Мінска адправіўся ў велавандроўку па Беларусі студэнт БДУ Іван Тужыкаў. Ён задумаў пераадолець прыблізна 4 000 кіламетраў за паўтара-два месяцы, каб наведаць у першую чаргу забытую архітэктурную спадчыну нашай зямлі — замкі, храмы, палацы, сядзібы, капліцы і іншыя збудаванні мінулых стагоддзяў, якія вартыя ўвагі, але не захаваліся ў першасным выглядзе. Напярэдадні старту мы сустрэліся з Іванам, каб задаць яму некалькі пытанняў. Малады чалавек расказаў, што скончыў другі курс геафака, ён будучы гідраметэаролаг.**

***— Калі задумаў вандроўку?***

— Два гады таму. Тады ўпершыню ў жыцці праехаў на ровары 155 кіламетраў — ад Мінска да Нарачы, і зразумеў, што кожны дзень па 100 кіламетраў можна ехаць і тысячу, і дзве тысячы. Даведаўся, што ёсць людзі, якія праязджалі 4-5 тысяч кіламетраў. У Гомелі жыве чалавек, які на ровары даехаў да Уладзівастока. Дык чаму б гэта не сумясціць з наведваннем дарагіх майму сэрцу руін, не зафіксаваць тое, чаго праз некаторы час можа не стаць, магчыма, прыцягнуць да праблемы ўвагу іншых людзей?



Летась я зняў відэаролік, прысвечаны архітэктурнай спадчыне, якая захавалася часткова, ён размешчаны на маіх акаўнтах у сацыяльных сетках. Тады планаваў ажыццявіць дадзеную вандроўку, але не атрымалася. У фільме аб'яднаў усё, што ўбачыў на працягу года: рэшткі царквы святых Пятра і Паўла ў Старынках Дзяржынскага раёна, палац Хмараў у Сёмкаве, картэзіянскі манастыр у Бярозе, сядзібу Кастравіцкіх на Шчучыншчыне, Брэсцкую крэпасць, капліцу і сядзібу Рэйтанаў пад Ляхавічамі, руіны палаца Манюшкаў-Маньковічаў у Смілавічах.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

Невядомы БДУ

# Студэнцкае жыццё — праз прызму гісторыі

**У інтэрнаце № 11 Студгарадка БДУ, што размяшчаецца на тэрыторыі Студэнцкай вёскі, адкрыўся Музей гісторыі студэнцкіх інтэрнатаў. Падзея была прымеркавана да стагадовага юбілею, які Белдзяржуніверсітэт адзначыць восенню бягучага года.**




— У аснову нашай ідэі была закладзена гістарычная рэтраспектыва самых значных падзей студэнцкага жыцця, пачынаючы з 1926 года, — расказвае **начальнік Студгарадка Ала МЕЛЕХ.** — Кожная тэматычная зона змяшчае адпаведныя экспанаты: тут і цалкам адноўлены пакой часоў СССР, архіўныя фотаздымкі, кнігі, макеты інтэрнатаў, падарункі ад гасцей, прадметы быту, узнагароды студэнтаў і супрацоўнікаў Студгарадка, атрыманыя ў розныя гады за ўдзел у арганізацыі рэспубліканскіх і міжнародных мерапрыемстваў, нават маецца газета «Студэнцкі гарадок», якая, на жаль, ужо не выпускаецца. Музей дазваляе студэнтам супаставіць той час і наш, чым яны адрозніваюцца і чым падобныя.

Дарэчы, месцам размяшчэння экспазіцыі інтэрнат № 11 быў абраны невыпадкова: на тэрыторыі сучаснай Студэнцкай вёскі ў сталіцы ён з'явіўся першым — яго адкрылі ў 2008 годзе. Таму было прынята рашэнне захаваць гісторыю менавіта тут. А першым экспанатам стаў чамадан студэнткі геафака БДУ.

— У яго, дарэчы, цікавая гісторыя, — кажа Ала Мелех. — Калісьці ў родным горадзе была ў мяне суседка — Вольга Канстанцінаўна. Аднойчы сустрэла яе ў двары, аказалася, што разам з сям'ёй яна вырашыла пераехаць у іншае месца, таму пазбаўлялася ад непатрэбных рэчаў. У руках у яе быў вялікі карычневы чамадан. Жанчына з цеплынёй расказала, што з ім звязана ўсё яе студэнцкае жыццё: разам з ім штогод заязджала ў інтэрнат, і таму ёй вельмі шкада яго выкідваць. Але магчымасці ўзяць з сабою таксама не было. Я і прапанавала, каб яна аддала мне сваю сямейную рэліквію. З яго і пачалася гісторыя нашага музея.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

*З «базай» у галаве*

# ІТ-АЛІМП ДЛЯ РАЗУМНІЦ

**Чатыры медалі заваявалі беларускія школьніцы на Еўрапейскай алімпіядзе па інфарматыцы для дзяўчат.**

Такія спаборніцтвы праводзіліся ўпершыню па мадэлі міжнароднай алімпіяды па інфарматыцы. Кожная краіна магла прадставіць каманду толькі з чатырох дзяўчат і двух трэнераў. На працягу двух дзён школьніцам прапаноўвалася за пяць гадзін выканаць па чатыры задачы. Усяго ўдзельнікамі інтэлектуальнай барацьбы сталі 156 школьніц з 39 краін свету, уключаючы Расію, Кітай, ЗША, Індыю, Японію, Бразілію, Канаду і іншыя.

«Золата» заваявала дзесяцікласніца віцебскай гімназіі № 8 Дар'я Гнядзько, сярэбраны медаль — васьмікласніца той жа навучальнай установы Анастасія Казлова і выпускніца Ліцэя БДУ Мілана Кананові́ч, а «бронзу» — навучэнка дзявятага класа віцебскай гімназіі № 1 Лізавета Ільіна. Кіраўнікамі беларускай зборнай выступілі настаўнік інфарматыкі Ліцэя БДУ Анжаліка Лапо і выкладчык ФПМІ БДУ Аляксандр Буслаўскі.

Алімпіяда скіравана на падтрымку цікавасці да вывучэння інфарматыкі і павелічэнне колькасці дзяўчат, якія ўдзельнічаюць у міжнародных спаборніцтвах па гэтым прадмеце. Першая алімпіяда была арганізавана ў Швейцарыі, спаборніцтвы прайшлі анлайн. У наступныя гады плануецца праводзіць іх штогод у розных краінах-удзельніцах.

*Не вучобай адной*

# СКАРБЫ РЭЧАК

**Артэфакты бытавой культуры сярэдзіны I — пачатку II тысячагоддзя нашай эры знойдзены каля вёскі з такой назвай у Вілейскім раёне падчас археалагічнай практыкі студэнтаў гістарычнага факультэта.**

На дадзены момант выяўлена больш за 1000 фрагментаў прадметаў: гэта старадаўнія ўпрыгажэнні, сярод якіх скроневыя кольцы, фрагменты бранзалетаў, фібулы, падвескі, шкляныя каралі, прылады працы, фрагменты ляпнога і керамічнага посуду, а таксама вялікая колькасць гліняных прасніц — грузікаў для верацяна. Знойдзеныя прадметы сведчаць аб вытворчасці вырабаў з жалеза, каляровага металу і гліны. Больш канкрэтную перыядызацыю знойдзеных артэфактаў дапамогуць устанавіць далейшыя навуковыя даследаванні.

Археалагічныя раскопкі ў Рэчках працягнуцца да канца ліпеня. За гэты перыяд археолагі плануюць знайсці жытло V—VII стагоддзяў з рэшткамі каменных печаў, а таксама сабраць калекцыю прадметаў для фонду вучэбнай лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта БДУ.

Археалагічны комплекс, які даследуецца гісторыкамі Белдзяржуніверсітэта, складаецца з двух умацаваных і аднаго неўмацаванага паселішчаў, а таксама курганнага могільніка. Дадзенае месца было выяўлена яшчэ ў сярэдзіне XIX стагоддзя, а першыя раскопкі ў 1850-х гадах праводзіў археолаг Адам Кіркор. Поўнамаштабнае даследаванне мясцовасці пачалося ў 2019 годзе пад кіраўніцтвам гісторыкаў БДУ. Перад імі стаіць задача даследаваць лад жыцця жыхароў паселішча, арганізацыю гаспадаркі і быту таго часу.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Студэнцкае жыццё — праз прызму гісторыі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Што было далей? Ала Мелех разам са спецыялістам па рабоце з моладдзю Цэнтра метадычнага забеспячэння рэалізацыі маладзёжнай палітыкі Студгарадка БДУ Ягорам БАГДАШОВЫМ звярнуліся да работнікаў універсітэта, бо многія з іх у свой час таксама жылі ў інтэрнаце і ў іх магло застацца нешта каштоўнае. «Так сабралі добрую базу. Усяго ў нас налічваецца больш за 300 экспанатаў. Музей пабудаваны па ўзор бесперапыннай лініі, якая ніколі не заканчваецца. Гэта як метафара жыцця маладых людзей: час ідзе, а студэнты заўсёды былі, ёсць і будуць», — дадала Ала Уладзіміраўна.

На адным са стэндаў з чорна-белымі фотаздымкамі — картка са студэнцкім вяселлем 1979 года, на іншай — будаўніцтва інтэрната ў 1981-м. Побач з імі цікавы экспанат — правілы пражывання ў інтэрнаце за 1926 год. Ягор удакладніў: у той час, напрыклад, абавязковай умовай для жыхароў інтэрната было наведванне лазні не менш за два разы на месяц, а тушыць святло на паверсе рубільнікам, дарэчы, трэба было пасля гадзіны ночы...

**«Студэнт большую частку часу праводзіць у інтэрнаце. Гэта магчымасць для яго адчуць сябе самастойным».**

— Мы неяк знайшлі ў архіве дакумент, у якім сказана, што кожны студэнт павінен адпрацаваць на будоўлі (тады будавалася якраз такі «пяцёрка») чатыры гадзіны ў месяц. Цяпер хлопцы і дзяўчаты таксама працуюць на карысць інтэрната тыя ж чатыры гадзіны, — адзначыла Ала Мелех.

Асаблівую ўвагу ў музеі прыцягвае экспазіцыя пакоя савецкага студэнта, аформленая ў стылі 1980-х. Бачым ужо знаёмы нам чамадан, а ў ім — музычныя пласцінкі, розныя саленні, вязаныя шкарпэткі. Атмасферу таго часу перадаюць шторы, унікальныя значкі, пінжак 1970-х гадоў і іншыя прадметы.

— Раней маладыя людзі заязджалі ў пакоі, дзе былі толькі ложак, стол і тумбачка. Усё астатняе везлі з сабой, каб стварыць утульнасць у інтэрнаце. На сцяну вешалі саматканыя дываны, а ложак засцілалі яркім пакрывалам. Вось гэты чырвоны дыван (яго Ала Уладзіміраўна нечакана дастала з-пад ложка. — **Аўт.**) застаўся яшчэ з летніх Алімпійскіх гульняў 1980 года. На ім ёсць і алімпійскія кольцы. Тады госці і спартсмены пражывалі на тэрыторыі нашага Студгарадка...

Дарэчы, Студэнцкі гарадок БДУ — самы старэйшы ў краіне. Датай яго стварэння лічыцца 6 верасня 1974 года. «Студэнт большую частку часу праводзіць у інтэрнаце. Гэта магчымасць для яго адчуць сябе самастойным. Нам хочацца, каб моладзь, якая будзе пражываць у нас, адчувала сябе як дома. І гэта нам удаецца: часта студэнты кажуць: «Інтэрнат — наш другі дом».






Да нас прыязджаюць былыя студэнты і часта прывозяць нешта цікавае. Напрыклад, загадчык інтэрната № 6 неяк прыгадаў, што ў яго ёсць журнал уліку насельнікаў 1999—2000 гадоў. Ён чымсьці падобны на цяперашні, але заўсёды цікава паглядзець арыгінальныя фатаграфіі студэнтаў, можна па прозвішчы знайсці старых сяброў, знаёмых», — падзялілася Ала Мелех.

— Амаль усе, хто завітвае да нас у музей, кажуць, што студэнцтва і жыццё ў інтэрнаце — самы лепшы час. Яно і зразумела: у інтэрнатах заўсёды праводзіцца вялікая колькасць мерапрыемстваў, і дыпломы, прадстаўленыя тут, — паказчык вельмі высокага іх узроўню. Нашы інтэрнаты не раз станавіліся найлепшымі як у раёне, так і ў горадзе. Таксама тут знаходзіцца сцяна падзяк, нават ад нашага прарэктара па выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Івана Янушэвіча ёсць падзяка. Дарэчы, у свой час ён скончыў гістарычны факультэт і жыў у інтэрнаце Студгарадка, а калі быў аспірантам, стварыў сям'ю, — дадаў Ягор.

Суразмоўнікі падзяліліся, што ў далейшым у музеі плануецца пашырэнне калекцыі экспанатаў, напрыклад, будзе створаны інфармацыйны стэнд аб кіраўніках Студгарадка. Бясплатна наведаць музей могуць усе ахвотныя, для гэтага дастаткова толькі загадзя запісацца на экскурсію.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота аўтара.**

*Медыяпрастора*

# Маладзёжныя прапановы для эфіраў

**Чатыры студэнцкія ініцыятывы БДУ перамаглі ў конкурсе тэлерадыёпраектаў «Цівіяр».**

Мерапрыемства было прымеркавана да 100-годдзя БДУ і 65-годдзя беларускага тэлебачання. Пераможцаў вызначалі ў дзвюх намінацыях: «Праект для тэлебачання/Youtube» і «Праект для радыё/Падкаст».

У катэгорыі тэлевізійных ініцыятыў «золата» заваяваў першакурснік факультэта журналістыкі Ігар Пракоп'еў (*на здымку*) з праектам рэаліці-шоу «Цяжкі падлетак». Другога месца ўдастоена ідэя «Маршрут дабра» навучэнкі Мінскага педагагічнага каледжа Нікаліны Кот, а трэцяе занялі выпускніцы факультэта журналістыкі Марыя Міхалевіч і Ганна Гукіш з праграмай «#Хочувребек».






Першае месца сярод радыёпраектаў прысуджана выпускніцы факультэта журналістыкі Валянціне Трубач з праграмай «Жыццё за мяжой гісторыі», а другое — яе аднакурсніку Максіму Цюценькову з праектам «...і гэта ў Беларусі». Трэцяга месца ўдастоены падкаст «Шчыроты падлеткаў» ліцэісткі Вікторыі Касцюк з Івацэвіч.

Усяго на конкурс было даслана каля 50 праграм для тэлебачання і радыё, аўтарамі якіх выступілі студэнты БДУ, ГрДУ імя Янкі Купалы, БрДУ імя А. С. Пушкіна, БДТУ, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Мінскага гарадскога педагагічнага каледжа, а таксама старшакласнікі з Баранавіч, Бабруйска, Бярозаўкі, Мазыра, Каменца, Івацэвіч і іншых населеных пунктаў.

Журы ацэньвалі арыгінальнасць і змястоўнасць праектаў, іх сацыяльную значнасць і перспектыву рэалізацыі. Пераможцы пройдуць стажыроўку ў Белтэлерадыёкампаніі і рэалізуюць свае творчыя напрацоўкі ў нацыянальным эфіры.

Арганізатарам конкурсу выступілі факультэт журналістыкі БДУ і Белтэлерадыёкампанія.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# У пошуках спадчыны, што знікае

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

У першыя пяць дзён сваёй вандроўкі Іван адзін праехаў больш за 350 кіламетраў: Гарадзішча — Строчыцы — Дзяржынск — Стоўбцы — Мір — Нясвіж — Сноў — Баранавічы — Ястрамбель — Альберцін — Слонім. Пра юцкаўскія крыніцы ў Дзяржынскім раёне напісаў: «Рэчышча змянілася за год, сляды апоўзняў, паваленыя дрэвы, халодная вада ў цясніне, якая сілкуецца крыніцамі. Мой рэкамендасьён».

На чацвёрты дзень нечакана для сябе хлопец убачыў руіны млына з часткова захаваным механізмам, колішні гасціны дом, сядзібу і лядоўню ў вёсцы Завушша. Гэта маёнтак Мараўскіх, пабудаваны ў XVIII стагоддзі. Дарэчы, жонка заснавальніка сядзібы Ігната Мараўскага — Тэафілія Радзівіл, сястра Караля Станіслава Радзівіла, Пане Каханку.

Ігнат і Тэафілія пабраліся шлюбам у 1770 годзе і тады ж распачалі ў мястэчку Завушша будаўніцтва. Матэрыялам для дома і двух флігеляў («афіцын») паслужыла лістоўніца. Дом, размешчаны ў самым цэнтры маёнтка, называўся «чырвоным» і складаўся з аднаго і двух паверхаў па цэнтры. Двухпавярховы будынак упрыгожвалі порцік і чатыры калоны тасканскага ордара. З тэрасы дома можна было выйсці ў парк, які ўяўляў з сябе дзве доўгія ліпавыя алеі, размешчаныя паралельна. Кожную дарожку ў канцы ўпрыгожвалі невялікія пляцоўкі і столікі для адпачынку паблізу ракі Уша. Газоны парку прыцягвалі ўвагу ўнікальнымі сартамі раслін, якімі любаваліся і гаспадары, і госці сядзібы. У 1785 годзе тут гасцяваў Станіслаў Панятоўскі, а ў 1818-м Тэафілія Мараўская прымала ў сваім маёнтку імператара Аляксандра I.




**Першапачатковы маршрут Івана: Мінск — Баранавічы — Пінск — Бяроза — Кобрын — Брэст — Каменец — Гродна... і далей па руху стрэлкі гадзінніка — па ўсёй Беларусі. Наогул чакаецца 450 прыпынкаў.**

Той жа дзень падарыў Івану Тужыкаву знаёмства з рэшткамі флігеля і адзінай у Беларусі брамай-стайняй у Вялікай Ліпе на Нясвіжчыне. Апошняя была пабудавана ў пачатку XIX стагоддзя ў стылі неаготыкі. Бакавыя ўваходы яе ўпрыгожаны барэльефамі ў выглядзе рыцараў, падлога — з брукаванкі. Калісьці брама мела невялікую вежу са шпілем.

За Слонімам вандроўка прыпынілася на пяць дзён, Іван вярнуўся ў Мінск, і 11 ліпеня працягнуў свой праект. На гэтым этапе ён задумаў праехаць на ровары каля 650 кіламетраў: Баранавічы — Крывошын — Выганашчы — Пінск — Бяроза — Брэст — Каменец — Белавежская пушча — Ваўкавыск — Гродна.

11 ліпеня было пераадолена каля 70 кіламетраў. Цікавыя прыпынкі — месца, дзе стаяў калісьці Ляхавіцкі замак, пахавальня Рэйтанаў, Крывошын. На наступны дзень — Пінск, які вельмі ўразіў.

«Пінск! Арганізм адпачывае, мозг атрымлівае асалоду ад прыгожага цэнтра горада, а я танцую з камерай вакол прыгожых будынкаў. Так, недарэмна кажуць, што Пінск — гэта мініяцюрны Гродна, — напісаў Іван на сваёй старонцы ў сацыяльных сетках. — Гораду ёсць куды расці. Упэўнены, у недалёкай будучыні яму вернуць ратушу, а па рацэ зноў будуць плаваць гандлёвыя караблі. Прынамсі, людзей, якія здольныя, жадаюць зрабіць горад лепшым, у Пінску дастаткова».



**Сядзіба Катлубаяў у Ястрамбелі XIX стагоддзя (Брэсцкая вобласць).**

У наступныя дні велавандроўнік пабываў у Дубым (вёска пад Пінскам), дзе расце 450-гадовы дуб, ёсць капліца, старажытныя могілкі і руіны сядзібнага дома. Наступны прыпынак — вёска Пескі Бярозаўскага раёна, дзе захавалася сядзібная брама. На 12-ы Іван здымаў картэзіянскі манастыр у Бярозе. Гэтай жамчужыне архітэктурнай спадчыны нашай краіны малады падарожнік прысвяціў асобны пост. 19 ліпеня Іван Тужыкаў ужо быў у Брэсце і планаваў накіравацца ў Гродна. Наперадзе яшчэ вялікі шлях і абяцанне новых сустрэч з малазнаёмай, але вартай асаблівай увагі, любові, гонару і клопату Беларуссю.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
**Фота Івана ТУЖЫКАВА.**

*У ліку найлепшых*

# ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ І ЎПАРТАСЦЬ З ЭКАЛАГІЧНЫМ УХІЛАМ

**Уладальніца залатога медалю на прэстыжным міжнародным конкурсе навуковых праектаў вучняў INTOC-2021 у Турцыі, адна з пераможцаў міжнароднага конкурсу экалагічных праектаў International Science and Invention Fair 2020 у Інданезіі — усё гэта пра 17-гадовую Кацярыну МАМАЕВУ, выпускніцу бараўлянскай сярэдняй школы. Дзяўчына ўжо абрала прафесію — яна паступае ў Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт на лячэбны факультэт. А пакуль яшчэ ёсць час на адпачынак, мы спыталі ў яе пра навуковую дзейнасць і асабістыя якасці, якія дапамагаюць дабівацца добрых вынікаў.**

— Маё захапленне навукай пачалося ў дзявятым класе, калі нам, школьнікам, прапанавалі з'ездзіць і пазнаёміцца з дзейнасцю Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства. У школе мне былі цікавыя біялогія і хімія, таму адчула, што хачу займацца гэтымі дысцыплінамі больш паглыблена. Абрала кірунак «Генетыка і селекцыя». Маім навуковым кіраўніком стаў намеснік кіраўніка лабараторыі Іван Анатолевіч Рускіх. Лічу яго цудоўным педагогам, які заўсёды гатовы дапамагчы сваім вучням. Першым праектам стала вывучэнне мікрафлоры хлеба. Праз некаторы час захацелася ўзяць нешта больш складанае, таму сышла ў мікрабіялогію, біятэхналогіі. Прыязджала ў цэнтр, калі толькі магла. Былі моманты, калі не ўдаваўся нейкі эксперымент і даводзілася нешта перарабляць, але я заўсёды брала сябе ў рукі з упэўненасцю, што ўсё атрымаецца. Побач са мной заўсёды былі мае бацькі, сябры, якія мяне падтрымлівалі.

**«Мне ўдалося здзівіць журы дзякуючы вялікай грунтоўнай рабоце, упэўненасці ў сваіх сілах і любові да таго, што раблю».**

Работа над апошнім праектам доўжылася год і была прысвечана вывучэнню бактэрый, якія засяляюць унутраныя тканкі раслін моху. Мы абралі пераважна групу тых з іх, якія здольныя фіксаваць атмасферны азот — яны называюцца азотфіксатары. Пры выкарыстанні прэпаратаў на аснове такіх штамаў можна знізіць колькасць азотнага ўгнаення, патрэбнага для апрацоўкі культурных раслін. Гэта з'яўляецца перспектыўным кірункам, паколькі атрыманыя біяпрэпараты будуць нашмат таннейшыя, чым альтэрнатыўныя варыянты, да таго ж яны здольныя стымуляваць рост раслін, засцерагаць іх ад хвароб, хутка дастаўляць ім азотнае або фосфарнае сілкаванне.




Менавіта з гэтай даследчай работай — «Вывучэнне азотфіксуючых эндафітных бактэрый для стымуляцыі росту раслін» — Каця выступала на міжнародным конкурсе навуковых работ у Турцыі, які, дарэчы, праводзіўся сёлета ўпершыню. Ён аб'яднаў больш за 300 удзельнікаў з 21 краіны свету, якія прэзентавалі свае праекты па фізіцы, інжынерыі, матэматыцы, прыкладных навуках аб жыцці, навакольным свеце і сацыяльных навуках.

— Спачатку прадставіла праект на рэспубліканскім узроўні, там атрымала дыплом другой ступені. Затым прыйшло запрашэнне паўдзельнічаць на міжнародным, я вельмі ўзрадавалася. Спачатку было хваляванне, потым прыйшло натхненне. Самастойна працавала над праектам, таму добра ведала, як найбольш удала расказаць аб ім. Конкурс доўжыўся два тыдні. Ішла туды з мэтай паказаць тое, як мне падабаецца займацца навуковай дзейнасцю па такім кірунку: калі здымаю відэаролікі пра свой праект, раблю справаздачу, ствараю постары, — для мяне гэта не руціннная праца. Калі б нават не заняла прызавое месца, не знервавалася б, таму што лічу — я зрабіла ўсё, што хацела і магла. Мне ўдалося здзівіць журы дзякуючы вялікай грунтоўнай рабоце, упэўненасці ў сваіх сілах і любові да таго, што раблю. Кожны з экспертаў пахваліў, прызнаюся, гэта вельмі прыемна. Штамамі, якія мы выдзелілі падчас даследчай работы, ужо зацікавіліся некаторыя інстытуты, мы перададзім іх, для таго каб спецыялісты правялі больш глыбокі аналіз, больш шырокае тэсціраванне на патагенную і іншыя ўласцівасці, каб біяпрэпараты былі цалкам бяспечныя для раслін, навакольнага асяроддзя і чалавека.

Што датычыцца конкурсу экалагічных праектаў International Science and Invention Fair 2020, то ён стаў для Кацярыны першым маштабным. «Гэта былі мой першы залаты медаль і першыя хвалюючыя незабыўныя эмоцыі. Вывучала эндафітныя бактэрыі, якія знаходзяцца ўнутры тканак дзікарослых дэкаратыўных раслін. І пасля на падставе атрыманых вынікаў распрацоўваліся біяпрэпараты. Веды, якія атрымала падчас работы над праектамі, безумоўна, спатрэбяцца як у жыцці, так і ў далейшай вучобе ва ўніверсітэце».

Каця кажа, што дабівацца добрых вынікаў па жыцці ёй дапамагаюць мэтанакіраванасць і трываласць. «Калі нешта пойдзе не так, я пачну рабіць гэта наноў. Не магу пакінуць справу на палове шляху, заўсёды даводжу яе да канца. Значнай падзеяй стала ўзнагарода нагрудным знакам «Лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў». Дадзеная акалічнасць дазваляе мне без уступных экзаменаў паступіць у любую ВНУ нашай краіны з біялагічным ухілам».

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота з архіва гераіні.**

*Новыя старты*

# Галоўны герой для свят альма-матэр

## Конкурс на распрацоўку студэнцкага талісмана абвешчаны ў БДУ

**Праект прымеркаваны да 100-гадовага юбілею ВНУ і праводзіцца з мэтай аб'яднання студэнцкай супольнасці, падтрымкі і рэалізацыі ініцыятыў, скіраваных на павышэнне аўтарытэту, захаванне і памнажэнне ўніверсітэцкіх традыцый.**

Да ўдзелу ў конкурсе на стварэнне студэнцкага талісмана запрашаюцца студэнты, магістранты, аспіранты і супрацоўнікі БДУ. Прымаюцца індывідуальныя і калектыўныя праекты.

Канкурсантам неабходна зарэгістравацца да 15 жніўня ўключна, запоўніць заяўку і прымацаваць графічную выяву талісмана. Важна прапанаваць вобраз, які асацыятыўна адлюстроўвае адметнасці студэнта БДУ, яго крэатыўнасць, унікальнасць, інтэлігентнасць, лідарскія якасці, імкненне да самаразвіцця і іншыя. Таксама важна пазначыць інфармацыю пра аўтараў распрацоўкі, імя талісмана і легенду яго стварэння.

Пераможцу абярэ спецыяльна створаная экспертная камісія. Галоўным прызам стане планшэтны камп'ютар.

На падставе найлепшай прапановы створаць роставую ляльку-талісман, якая ў далейшым будзе галоўным героем на студэнцкіх святах і мерапрыемствах.

Арганізатарам конкурсу выступае ўпраўленне па выхаваўчай рабоце БДУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

SEX-БАЛЯСЫ

# РЭЦЭПТЫ КАХАННЯ

**Чулі адну цікавую навіну? Спецыялісты з навукова-даследчага цэнтра здароўя пры Універсітэце штата Тэхас (ЗША) высветлілі, што тыя мужчыны, якія ўжываюць у дзень два-тры кубкі кавы, куды радзей за сваіх сучаснікаў сутыкаюцца з эрэктыльнай дысфункцыяй. А яшчэ ж зусім нядаўна казалі пра шкоду кафеіну! Ды хто ведаў, той ведаў і раней, што да чаго... («Кава — чароўны напой. Колькі людзей нарадзілася дзякуючы запрашэнню «на кубачак кавы».) Больш за тое, як піша Maxim, навукоўцы таксама параўналі ўздзеянне кафеіну з эфектам ад «віягры». Абодва рэчывы ўзмацняюць прыток крыві да самі ведаеце чаго. («— Дзяўчына, а можна вам каву заказаць... ці гарбату... ці кактэйль? — Мы яшчэ не знаёмыя, а ты мяне ўжо сваёй нерашучасцю прыводзіш у шаленства!»)**

Іншы цікавы момант: адзін з даследчыкаў заявіў, што падобны станоўчы ўплыў кафеіну на патэнцыю асабліва прыкметны ў мужчын з лішняй вагой. («— У мяне малады растучы арганізм! — Толя, таўсцець у 40 гадоў не так называецца».) Чаму пашанцавала менавіта ім, навукоўцы пакуль не высветлілі. («Прыходзіш дадому, варыш каву, сядаеш у крэсла, вакол цішыня... І кожны з нас сам выбірае, што гэта — адзінота ці свабода».) Так што навукоўцы раяць раз-пораз падліваць сабе кавы. Але лепш не захапляцца: злоўжыванне напоем вядзе да сардэчнай недастатковасці. Гэта значыць, што праблем з патэнцыяй, можа, і не будзе, але скарыстацца ёю ўсё роўна будзе немагчыма. («— Часам мне падаецца, што я магу ўсё. А потым кава перастае дзейнічаць».)

Зрэшты, эксперты ўжо называлі топ-10 прадуктаў, якія паляпшаюць сексуальнае здароўе, паколькі рацыён непасрэдна ўплывае на інтымнае жыццё і жанчын, і мужчын. («— Пайшлі пажаром? — Зараз дзве гадзіны ночы! — Я ў цябе не час спытала!») Спецыялісты кажуць, што ў яго варта дадаць прадукты, якія збалансуюць узровень гармонаў і ўзмоцняць прыток крыві да органаў малога таза, тым самым стымулюючы палавую цягу. («Жывеш без бабы: на вячэру жарэш макароны. Жывеш з бабай: на вячэру ясі з любою прыгатаваныя спагеці».) Гэта вустрыцы, ласось, стэйк, спаржа, перац чылі, авакада, вада (так, аказваецца, і яна працуе ў вышэйназваным кірунку!), грэцкія арэхі, ківі, карыца. («— Я па натуры філасоф. Для мяне няма розніцы, што есці: чорную ікру ці чорны хлеб. — Але, я гляджу, ты ўсё ж ясі ікру, а не хлеб. — Дык няма ж розніцы!») Але калі піць ваду і есці грэцкія арэхі з булачкай з карыцай можна хоць кожны дзень, дык вось на стэйкі і вустрыцы разлічваць даводзіцца не кожнаму... («Філе сібасіса на падушцы з цукіні...» Акуня на кабачок паклалі, а колькі пантоў!») Пішуць, праўда, што апошнія можна замяніць на нятлустае чырвонае мяса, але парада, пагадзіцеся, так сабе. («Як яны могуць называць свае ўстановы «Дамашняя кухня», калі ў меню няма ўчарашняй смажанай бульбачкі і салатнай жыжы з хлябком?!».) Ну ды і бог з імі, гэтымі афрадызіякамі. Рэцэпты — гэта ж не толькі самі стравы. («— Дарагая, што ў нас на вячэру? — Нічога! — Як і ўчора? — Так, адразу на два дні нагатавала!») Сямейная кулінарыя ў больш шырокім сэнсе — гэта яшчэ і клопат, увага адно да аднаго. («— Мілы, скажы мне на ноч тое, што я хачу пачуць. — Смачна есці».) Можна ж яшчэ здзівіць сваю другую палавінку, зрабіць ёй нейкі сюрпрыз. («Жанчыне на заметку: калі муж з апетытам есць прыгатаваную вамі кашу і нахвальвае яе, не варта прызнавацца, што гэта суп».) А сумеснае баўленне часу на кухні, дапамога, яшчэ ўмацоўваюць стасункі. («Навукова даказаны факт: яшчэ ні адна жонка не забіла свайго мужа ў той момант, калі ён мыў посуд».) Зноў жа — нешта разам можна прыгатаваць, не ўсё ж адной жонцы гэтым займацца. («Гэты няёмкі момант, калі ты ўвесь дзень ляпіла пельмені, а муж паеў і папрасіў больш такіх не купляць».)



Вось трапіў мне неяк на вочы адзін не вельмі складаны рэцэпт. («Салата «Металург»: тры сталовыя лыжкі, дзве чайныя».) Падавалася б, нармальны, а не з тых... («На мой погляд, некаторыя відэа з кулінарнымі рэцэптамі прыгатавання пэўных страў павінны пачынацца з фразы: («Вазьміце выхадны і палову зарплаты».) Адной сваёй назвай увагу прыцягнуў, што адразу слінкі пацяклі. Называўся ён «Бараніна з кацялка». О, думаю, прыгатаваць можна будзе разам з жонкай. («Кветкі — не самы практычны падарунак на 8 Сакавіка. Пастаяць пару дзён, а далей на сметнік. Іншая справа — свіная галава. Гэта і суп, і халадзец, і проста прыгожа). Чытаю, што патрэбна для прыгатавання: тры цыбуліны, два буйныя салодкія перцы, два баклажаны, чатыры памідоры, два зубкі часнаку... І толькі потым — шэсць галёнак ці кіло шыі... З інгрэдыентаў там яшчэ толькі спецыі заставаліся... Дык што не так, спытаеце вы? Для мужчыны, калі ў рэцэпце напісана «Бараніна з кацялка», дык і пачынацца той павінен з яе. Ёсць яна — астатняе само дадасца. («Таблеткі ад голаду называюцца катлеткі».) І хто той рэцэпт пісаў? («Калі шлях жанчыны да сэрца мужчыны ляжыць праз яго страўнік, дык было б лагічна, калі б жанчыны вадзілі мужчын у кавярні і рэстараны, а не наадварот».) Таму што для большасці мужчын шмат мяса не бывае. («— Я веган. — Ды ў цябе проста добрага шашлыку не было!») Рэцэпты ж кахання розныя бываюць...

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «НЕ ВАРТА НАВЯЗВАЦЬ СВАЕ ЎЯЎЛЕННІ АБ ПРЫГАЖОСЦІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Якія яшчэ тэмы сацыяльнай накіраванасці вас цікавяць сёння?***

— Булінг, стандартызацыя прыгажосці... Аднак не варта навязваць свае ўяўленні аб прыгажосці. Я не ведаю прычыны, аднак у школе адчувала непрыманне сябе іншымі дзецьмі. Але ж ім часам і прычына не патрэбная альбо яны могуць яе нават не ўсведамляць. Проста мае мары, імкненні адрозніваліся ад іхніх. Плюс я была высокая і худая, а калі ты не такі, як іншыя, то з цябе могуць здзекавацца. Таму ўсё, што ў мяне складвалася, у тым ліку і сяброўства, адбывалася ўжо ў іншых кампаніях.

***— Пайсці ў мадэлі — уласнае жаданне ці ідэя бацькоў?***

— Перш за ўсё маё ўласнае, паколькі я вельмі нервавалася з-за таго, што высокая і худая. Мяне аддалі ў мадэльную школу, каб павысіць самаацэнку і паказаць, што гэта не недахоп, а наадварот, можа стаць перавагай, і ў будучым у дадзеным рэчышчы можна пабудаваць кар'еру. Вядома, я не ставіла мэту быць супермадэллю, але пачала працаваць — і справа мяне зацягнула.




***— А калі з'явілася ўпэўненасць, што вы паспяховая ў тым, чым займаецеся?***

— Я думаю, гэтае адчуванне ўзнікла тады, калі пачала ўдзельнічаць у конкурсах прыгажосці. Я атрымлівала ўзнагароды і разумела, што нечага дасягнула. Калі ж гаварыць пра мадэльны бізнес, то тут пунктам такога адліку стаў кантракт у Мілане, бо такога кшталту работу я лічыла для сябе паказчыкам мадэльнага прафесіяналізму. Потым ужо пачаліся здымкі для вокладак часопісаў і іншыя моманты. Усё складваецца з дэталяў, і чым іх больш, тым больш ты разумееш, што ўжо маеш што паказаць і расказаць пра сябе.

***— Раскажыце пра сваю сям'ю.***

— Тата ў мяне займаецца бізнесам, а мама была рэжысёрам дзіцячай тэатральнай студыі, дзе я таксама займалася. Мама заўсёды падтрымлівала мяне ў любых эксперыментах і пошуках сябе. Так, калі ў 12 гадоў я захацела пафарбаваць валасы ў зялёны колер, то яна мне нават дапамагла гэта зрабіць. Цяпер на падобнае мяне ўжо не цягне. Я засяроджана на сваёй рэалізацыі.

***— У вас здараюцца перыяды няver'я ў сябе?***

— Ва ўсіх бываюць узлёты і падзенні. Перамагае той, хто ўстае на адзін раз больш, чым падае. Бо такое жыццё. Ты не можаш увесь час быць на пазітыве, адчуваць сябе ўпэўнена. Але нават калі здараюцца дрэнныя дні, то не варта расстройвацца. Неабходна проста разумець, што ўсё пройдзе.



***— А ў што верыце, акрамя як ва ўласныя сілы?***

— У сяброўства, у сілу ведаў і ў тое, што ўсяго можна дасягнуць працай. Усе мэты трэба разбіраць, раскладваць на крокі і дзейнічаць, бо няма нічога немагчымага. Любую мару можна здзейсніць, калі правільна да яе падысці.

***— Раскажыце, адкуль узялося захапленне эканомікай?***

— Яшчэ ў дзяцінстве я думала пра тое, што буду вучыцца на фінансіста. І маё жаданне рэалізавалася. Мяркую, гэта звязана з тым, што эканамічная адукацыя можа спатрэбіцца ў любой сферы дзейнасці. Тая ж сусветная эканоміка — для мяне проста космас.

Я ведаю цану адукацыі. Лічу, што вучоба ва ўніверсітэце — гэта аснова, хоць, зразумела, яна патрабуе часу, але там рыхтуюць якасных спецыялістаў.

***— Яшчэ нечым цікавіцеся?***

— Магу і кніжку пачытаць, і на вечарынцы з сябрамі пабыць, але гэта не кожны дзень. Бываюць перыяды, калі я некалькі дзён сяджу дома, а потым назапашваецца энергія і хочацца ў кампанію. Усе мае захапленні базуюцца ў сферы шоу-бізнесу, конкурсаў прыгажосці, фатаграфіі. Я займаюся вакалам, хаджу на танцы, брала ўрокі акцёрскага майстэрства. Мне падабаецца вывучаць замежныя мовы. Хачу вывучыць іспанскую, кітайскую і арабскую мовы. Думаю, калі б ведала іх, то была б шчаслівая...

***— Якой вы бачыце сябе гадоў праз дзесяць?***

— Шляхоў кар'ернага развіцця ў мадэльным бізнесе шмат. Усе ведаюць тыя ж прыклады Наомі Кэмпбэл, Кейт Мос і іншых. Але мне ў перспектыве хацелася б стварыць свой конкурс прыгажосці. Праз дзесяць гадоў я бачу сябе бізнес-лэдзі, і думаю, што ў мяне ўжо нават з'явіцца сям'я. Увогуле, хочацца самастойна развівацца ў шоу-бізнесе, а таксама дапамагаць іншым дзяўчатам дамагацца сваіх мэт: ажыццяўляць свае мары ў сферы прыгажосці.

**Алена ДРАПКО.**

**Фота з архіва гераіні.**

## Бліц-апытанне

1. — *Калі хочаш змяніць свет, то...* — Пачні з сябе.

2. — *Галоўны ўрок, які вы спасціглі ў мадэлінгу?* — Уменне прымаць сябе такой, якая я ёсць, і ўспрымаць розныя тыпы прыгажосці.

3. — *Ці варта дзецям расказваць казкі, калі яны не адлюстроўваюць рэальнасць?* — Я думаю, варта гэта рабіць, каб даваць дзецям мару і эталон, да якога неабходна імкнуцца. Але ж і тлумачыць, як можа быць у рэальнасці.

4. — *У ацэнках і парадах збоку вы давяраеце...* — Самой сабе ці вельмі моцным экспертам.

5. — *Лёс ці ўдача: на што вы больш разлічваеце па жыцці?* — Мне важныя абодва кампаненты. Таму што калі ёсць шанц і ўсё складваецца ўдала, то тады ты гэта атрымаеш. Аднак патрэбнае супадзенне фактараў.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 21.07.2021 г.

# І З КАРАНАВІРУСАМ

## У роўных умовах

**Феномен Алімпійскіх гульняў як спаборніцтваў заключаецца ў тым, што кожныя чатыры гады людзі, якія зусім не цікавяцца спортам, чытаюць спартыўныя навіны. За ўсе гады свайго існавання чалавецтва не прыдумала больш знакавай і грандыёзнай падзеі. Сёлета з улікам усяго, што адбываецца ў свеце, інтарэс да Алімпіяды большы, чым звычайна. Бадай, ні пра адны Гульні не казалі столькі, як пра гэтыя. Але галоўнай тэмай і вядучай інфападставай застаюцца спартсмены. «Звязда» распытала трэнераў і прадстаўнікоў спартыўных федэрацый, як да Алімпійскіх гульняў падыходзяць беларусы.**

### ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА (30 ліпеня — 8 жніўня)

Прадстаўніцтва «каралевы спорту» — самае вялікае ў беларускай алімпійскай камандзе. На старты Токіа выйдуць 34 беларусы, якія выступяць у 22 дысцыплінах з 47 відаў лёгкай атлетыкі. Пачынаючы з Алімпіяды 2000 года, за выключэннем 2012-га, з кожнай алімпійскай сталіцы беларусы вярталіся з медалямі. У інтэрв'ю «Звяздзе» **галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Юрый МАЙСЕВІЧ** адзначаў, што лёгкаатлетычная барацьба ў Токіа будзе ісці ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі. Разам з тым беларусы разлічваюць выйсці ў фінал ва васьмі-дзесяці відах.

«У лёгкай атлетыцы ёсць такое правіла, калі хочаш заваяваць медаль у пэўным відзе, трэба мець тры чалавекі, на гэта здольныя. У нашай камандзе 34 атлеты, і трэцяя частка спартсменаў можа змагацца за фінал. Гэта якраз восем-дзесяць відаў. І будзе добра, калі ў іх тое атрымаецца. А што будзе ў саміх фіналах — паглядзім. Не будзем дражніць Фартуну».

### ВЕСЛАВАННЕ НА БАЙДАРКАХ І КАНОЭ (25 ліпеня — 7 жніўня)

На Алімпійскіх гульнях — 1960 у Рыме беларусы ўпершыню падняліся на найвышэйшую прыступку алімпійскага п'едэстала. Леанід Гейштар і Сяргей Макаранка перамаглі ў гонцы каноэ-двойкі на 1000 метраў. Пасля былі перамогі Уладзіміра Парфяновіча, Дзмітрыя Даўгалёнка, Аляксея Абалмасава, Андрэя і Аляксандра Багдановічаў, Артура Літвінчука, Вадзіма Махнёва, Рамана Петрушэнкі. Дзякуючы ім веславанне на байдарках і каноэ стала своеасаблівым спартыўным брэндам Беларусі. Сёлета ў алімпійскую сталіцу едуць 12 беларускіх спартсменаў. **Галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Уладзімір ШАНТАРОВІЧ** расказаў, як яго вучні падыходзяць да алімпіяды: «Ёсць мабілізацыя весляра, але на Алімпіядзе павінна быць мабілізацыя воіна. Супраць ветру плывеш, бакавы вецер — для воіна гэта павінна быць абыякава. Я настройваў каманду менавіта так. Любое спаборніцтва, якое завяршае алімпійскі цыкл, гэта самае сур'ёзнае выпрабаванне. Можна выйграць пяць чэмпіянатаў свету, але выйграць Алімпіяду не заўсёды ўсім даступна. І раз на чатыры гады трэба праявіць моцную мабілізацыю. Алімпійскія гульні — гэта падвядзенне вынікаў развіцця віду спорту ў краіне, гэта нават падвядзенне вынікаў эканамічнага развіцця краіны».

### СУЧАСНАЕ ПЯЦІБОР'Е (5 — 7 жніўня)

Гэты від спорту — сапраўдны серыял. Героі розных узростаў з розных краін за адзін дзень выходзяць на арэну для фехтавання і стадыён для бегу, плаваюць у басейне, страляюць па мішэнях і пераадольваюць перашкоды на кані. З 2016 года з беларускай нацыянальнай камандай працуе трэнер з сусветным імем — **польскі спецыяліст Вальдэмар Дарыуш дэ МАКАЙ.** Ён вывеў беларускую каманду ў лідары сусветнага пяцібор'я. Цяпер каманда падрыхтавала алімпійскі сезон спартыўнага серыяла.

«Для мяне гэта ўжо сёмыя Алімпійскія гульні з пятай краінай. З беларусамі гэта першая Алімпіяда. Усе думаюць, што Алімпійскія гульні — гэта асаблівыя спаборніцтвы, так яно і ёсць. Але на самай справе гэта такі ж турнір, як і ўсе. Аднак тут ва ўсіх зусім іншыя жаданні. Можна выйграць дзесяць чэмпіянатаў свету, але калі няма алімпійскага медаля, адчуванні іншыя. А калі ёсць хоць бы «бронза», то адразу ў гісторыю ўваходзіш. У нас было мала міжнародных стартаў. Нядаўнія чэмпіянаты свету і Еўропы сталі добрай праверкай сіл, і ў нас там добра ўсё атрымалася, вынікі пайшлі ўверх. Спадзяёмся, што і ў Токіа будзе гэтак жа», — падзяліўся трэнер.

### ДЗЮДО (24 — 31 ліпеня)

Адзін з прынцыпаў дадзенага віду спорту — узаемныя дапамога і разуменне для дасягнення большага прагрэсу. Менавіта гэтым кіруюцца беларускія спартсмены. Яны разам пераадольваюць цяжкасці, сябруюць, падтрымліваюць адзін аднаго. А ў цэнтры дружнай спартыўнай сям'і — **трэнер нацыянальнай зборнай па дзюдо Леанід СВІРЫД**, якому старшыня федэрацыі Павел Ясяноўскі жадае захоўваць спакой на Алімпійскіх гульнях у Токіа.

«Мы прайшлі вялікі шлях, усе ідуць да сваёй мэты, яна ў нас адна. Зразумела, мы яе не агучваем, бо ўсе і так разумеюць. Тыя задачы, якія ставіліся перад спартсменамі, яны выкананы — нашы дзюдаісты на Алімпійскіх гульнях. Быў складаны адбор, тры гады, шмат згонак вагі, шмат траўмаў, шмат псіхаэмацыянальных стрэсаў, але нашы атлеты ўсё пераадолелі», — адзначыў ён.

### ПЛАВАННЕ (24 ліпеня — 5 жніўня)

Плаванне — адзін з самых медалеёмістых відаў спорту. Галоўны старт у Токіа не павінен стаць выключэннем, тым больш што з японскай сталіцай беларуская плыўцы добра знаёмы. У 2019 годзе на этапе Кубка свету беларусы сабралі там россып медалёў.

«Галоўнае, каб атрымалася ўсё, да чаго мы доўга ішлі і імкнуліся. Усе абмежаванні, звязаныя з каранавірусам, на баявы дух спартсменаў не паўплываюць, мы ўжо выступалі ў падобных умовах. Але яны могуць паўплываць на фізічны стан, спартсмены будуць пастаянна дыхаць у маску, а потым выходзіць на старт. А правільнае дыханне — вельмі важнае для плыўцоў. Ускладніць сітуацыю і павышаная вільготнасць Токіа. Але мы ўжо там выступалі. І спадзяюся, што ўсё будзе добра», — адзначыла **старшы трэнер нацыянальнай каманды па плаванні Алена МАЛЮСКА.**

### БАРАЦЬБА (1—7 жніўня)

Доўгі час увесь беларускі спорт асацыіраваўся з імем барца — трохразовым алімпійскім чэмпіёнам Аляксандрам Мядзведзем. Сучасныя беларускія барцы ад сваіх папярэднікаў не адстаюць. У Токіа едзе моцны ва ўсіх сэнсах барцоўскі дэсант. Як адзначыў **старшыня Беларускай федэрацыі барацьбы Алім СЕЛІМАЎ**, спартсмены хоць і маладыя, але вопытныя, паспелі прайсці агонь, ваду і медныя трубы: «Яны ведаюць, куды едуць. У нас атрымаўся добры сезон, заваявалі шмат медалёў. Але не той хлеб, што на полі, і я спадзяюся, што і пасля Алімпіяды змагу сказаць тое ж самае. Кожны спартсмен, які б ён ні быў знакаміты, хвалюецца перад Алімпіядай. Трэба быць абыякавым чалавекам, каб выходзіць на такі адказны старт без эмоцый. У нашай камандзе ва ўсіх халодная галава. І я думаю, яны разумеюць адказнасць старту. Будзе нялёгка. Але ўсе ў такіх умовах. Усё наша жыццё — барацьба, і прыходзіцца змагацца на дыване і па-за ім», — сказаў ён.

### ТЭНІС (24 ліпеня — 1 жніўня)

Алімпійскія спаборніцтвы па тэнісе пройдуць на пакрыцці корта — «хардзе», на якім у беларусаў атрымліваецца паказваць добрыя вынікі. Такая акалічнасць дадае аптымізму аматарам, бо пакрыццё ў тэнісе мае значэнне. Але не меншае значэнне маюць надвор'е, псіхалагічная настроенасць і яшчэ шэраг умоў.

«Спецыфіка нашага віду спорту тым добрая, што ў нас пастаянная змена клімату, кантынентаў, часавых паясоў. Тэнісісты з юніёрскага ўзросту да гэтага прывыкаюць. Прыкладна 80 % нашых турніраў праходзіць у гарачым клімаце, у спякоце. І Токіа не надта выдзяляецца. Праблем з акліматызацыяй быць не павінна. Усе спартсмены, якія едуць на Алімпійскія гульні, едуць туды па медалі. У жаночай сетцы заяўлены ўсе з топ-20. І не трэба рабіць прагнозаў, а трэба толькі верыць, спадзявацца і ўсёй краінай падтрымліваць. Многае на Алімпіядзе вырашае псіхалогія. Выступаць, калі ты адказваеш толькі за сябе — гэта адно, а выступаць за краіну — гэта зусім іншае», — адзначыла **старшы трэнер жаночай нацыянальнай каманды Таццяна ПУЧАК.**

**Старшы трэнер мужчынскай нацыянальнай каманды Дзмітрый ЖЫРМОНТ** канстатаваў, што мужчынская частка тэніснай каманды вельмі зматываваная перад выступленнем у Токіа. «Яны гараць гэтай Алімпіядай. Пападанне на Алімпійскія гульні і выступленне за зборную — гэта вялікі крок для Ілы Івашкі і Ягора Герасімава. Яны моцна матываваныя і хочуць паказаць вынік», — заўважыў ён.

### СПАРТЫЎНАЯ ГІМНАСТЫКА (24 ліпеня — 3 жніўня)

Планавалася, што ў Токіа будзе выступаць Настасся Алістратава. Але праблемы са здароўем у апошні момант унеслі свае карэктывы ў планы спартсменкі. Першай запаснай гімнасткай па рэйтынгу была Ганна Траўкова, якая і адпраўляецца ў японскую сталіцу.

«Ганна — вельмі добрасумленная, прыстойная, адказная дзяўчынка. У мяне як у трэнера няма да яе ніякіх прэтэнзій. Для яе вялікі гонар прадстаўляць краіну, горад, школу на Алімпійскіх гульнях. Зразумела, нам складана. У нас амаль не было часу на падрыхтоўку непасрэдна да Алімпійскіх гульняў. Ганна цяпер робіць усё магчымае, каб добра выступіць. Вельмі складана, што няма каманды. Мы няўдала прылятаем у Токіа. Будзем выступаць у дні, калі яшчэ будзе праходзіць акліматызацыя. Трэба было ляцець або на тры дні раней, або на тры дні пазней, а так выступленне трапляе на самыя цяжкія дні. Але будзем старацца выходзіць з гэтага становішча», — падзялілася **трэнер** Ганны Траўковай **Вольга КНЫШ.**

### СТРАЛЬБА (24 ліпеня — 2 жніўня)

Патэнцыйна заваяваць алімпійскія ліцэнзіі ў вышэй згаданым відзе спорту маглі ўсе беларускія спартсмены. Трэнерскі штаб разлічваў на кожнага снайпера. Але ў Токіа едуць толькі тры беларусы — Вікторыя Чайка, Марыя Мартынава і Юрый Шчэрбацэвіч, вядучыя стралкі краіны. «Мы разлічвалі заваяваць пабольш ліцэнзій. Але спорт ёсць спорт, і ў моладзі пакуль не атрымалася праявіць сябе ў поўнай меры. Значыць, ім яшчэ рана», — адзначыў **галоўны трэнер каманды Ігар БАСІНСКІ.** Выступленні па кулявой стральбе праходзяць на адкрытым паветры, таму японскае надвор'е таксама ўскладніць выступленні стралкоў. Да таго ж выступаць яны будуць у новым ціры, спецыяльна пабудаваным да Гульняў. «На месцы будзем арыентавацца, як нам сябе паводзіць, якую стратэгію прымяняць. У нас будзе некалькі дзён, каб патрэніравацца, і чатырох трэніровак нам павінна хапіць», — упэўнены Ігар Басінскі.

### ПАРУСНЫ СПОРТ (25 ліпеня — 4 жніўня)

Прадстаўнікам паруснага спорту з Токіа пашанцавала больш, чым іншым. Як расказаў **старшыня беларускай федэрацыі** па гэтым відзе **Алег СПОЛАН**, у 2019 годзе ў японскай сталіцы, у алімпійскай акваторыі, праходзіла передалімпійская рэгата. Там жа і ў тым жа годзе на чэмпіянаце свету Таццяна Драздоўская заваявала ліцэнзію на Гульні. Да таго ж парусны спорт як ніякі іншы звыклы да спякоты і няпростага клімату. Але не ўсё так добра, як хацелася б.

«Мы хацелі заваяваць тры ліцэнзіі. Але ў адным відзе спартсмен захварэў на каранавірус і не паспеў аднавіцца да адбору на алімпіяду. Не атрымалася і ўзяць аднаго экіпажа — спартсмена прызвалі ў армію. Але мы верым у Таццяну і Мікіту. Алімпійскія гульні — заўсёды непрадказальная падзея. І бывае, што прыязджаюць маладыя, рашучыя спартсмены, яны не ведаюць страху і адразу перамагаюць. А бывае, што выйграць дапамагае вопыт», — выказаўся на гэты конт Алег Сполан.

### СІНХРОННАЕ ПЛАВАННЕ (2 жніўня — 7 жніўня)

У лістападзе 2020 года ў інтэрв'ю «Звяздзе» **галоўны трэнер нацыянальнай зборнай па сінхронным плаванні Алена СВЯТЛІЧНАЯ** галоўнай мэтай для сябе і сваіх вучаніц называла адбор на Алімпійскія гульні ў Токіа. У чэрвені 2021 года мэта спартыўнага дуэта і іх трэнера стала рэальнасцю.

«У мяне, як і ў дзяўчат, гэта першая Алімпіяда. І я як трэнер вельмі хвалююся.

# МОЖНА СПАБОРНІЧАЦЬ

## і з баявым настроем

Вядома, з-за масачнага рэжыму могуць узнікнуць праблемы з дыханнем. Але ў нас і на адборы былі такія ж абмежаванні, і таму мы ўжо прызвычаіліся і будзем адаптавацца. На жаль, не паспеем як след акліматызавацца. Мы прыязджаем за пяць дзён да старту, а трэба хоць бы за дзесяць. Правесці збор у нас няма фінансавання, таму будзем спраўляцца сваімі сіламі», — перадае Алена Святлічная.



### МАСТАЦКАЯ ГІМНАСТЫКА (6 — 8 жніўня)

У лістападзе ў інтэрв'ю «Звяздзе» **старшы трэнер нацыянальнай зборнай, суддзя, бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў 2012 года Любоў ЧАРКАШЫНА** адзначала, што ў апошнія гады мастацкая гімнастыка вельмі змянілася. І ад гэтага выступленні спарстменак становяцца больш цікавыя і для спецыялістаў, і для аматараў.

«Выступленне на Алімпійскіх гульнях судзіцца па асабістым мнагабор'і, таму трэба выканаць максімум ва ўсіх практыкаваннях. Але калі паглядзець міжнародныя спаборніцтвы, у нашых адзіночніц больш за ўсё медалёў з мячом. Самая складаная заўсёды стужка — то яна мокрая, то завязваецца, то ляціць не туды... Сучасная гімнастыка моцна амаладзілася. І спартсменкі ў 16–19 гадоў вельмі смелыя, па-добраму самаўпэўненыя. Яны не баяцца рабіць тое, што раней здавалася немагчымым», — акрэсліла сітуацыю яна.

### ВЕЛАСПОРТ (24 ліпеня — 8 жніўня)

Алімпійская каманда Беларусі па веласіпедным спорце — гэта людзі, якія прайшлі складаныя спартыўныя выпрабаванні. Ім пакараліся самыя цяжкія трасы і самыя адказныя спаборніцтвы. І гэта невыпадкова, бо працуюць са спартсменамі людзі, якія выдатна ведаюць, як прыручыць жалезнага двухколавага каня. Галоўны трэнер нацыянальнай зборнай — адзін з самых тытулаваных велагоншчыкаў Беларусі Васіль Кірыенка. А **старшыня федэрацыі веласпорту — бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў Наталля ЦЫЛІНСКАЯ.**

«Настрой у каманды баявы, і гэта натуральна. На Алімпійскіх гульнях не можа быць іншага настрою. Складанасці будуць ва ўсіх, і ўсе гэта разумеюць. Цяжкасці існуюць для таго, каб іх пераадольваць, і нас яны не спыняць. Лепш за ўсё — менш думаць аб усялякіх складанасцях. Трэба проста выконваць сваю работу, якую ты кожны дзень выконваеш добра, а інакш ты б проста тут не быў», — адзначыла Наталля Цылінская. Для вопытнай спартсменкі гэта першая Алімпіяда, дзе яна выступае ў ролі кіраўніка федэрацыі: «Маючы вопыт іншых спаборніцтваў, скажу, што ўдзельнічаць у іх у ролі кіраўніка эмацыянальна складана. Калі ты спартсмен, ты адказваеш толькі за сябе. А калі ты кіраўнік, то ты адказваеш за іх усіх, перажываеш і верыш у іх. І гэта нялёгка, але вельмі прыемна».

### АКАДЭМІЧНАЕ ВЕСЛАВАННЕ (23 — 30 ліпеня)

Алімпійскія гульні ў Токіа павінны былі стаць сёмымі ў кар'еры легенды беларускага і сусветнага акадэмічнага веславання Кацярыны Карстэн. Аднак летам 2019 года «Кацярына Вялікая» завяршыла кар'еру. Традыцыі, закладзеныя легендарнай спартсменкай, у Токіа будуць працягваць прадстаўнікі новага пакалення «акадэмікаў». **Галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Юрый РЫДАЁНАЎ** упэўнены, што ў іх гэта атрымаецца.

«Я думаю, што псіхалагічна спартсмены гатовыя да ўсіх непрыемнасцяў і цяжкасцяў, якія могуць іх чакаць у Токіа. І статыстамі яны на гэтай Алімпіядзе не будуць — гэта 100 працэнтаў. Будуць змагацца за самыя высокія месцы, якія ставяць сваёй мэтай», — адзначыў ён.

Складанасці дабаўляе і тое, што весляры не апрабавалі алімпійскія аб'екты. Але, як адзначыў трэнер зборнай, у 2019 годзе падчас чэмпіянату свету сярод юнакоў тое зрабілі беларускія спецыялісты. «Інфармацыя з першых вуснаў у нас ёсць. Але гэта было да ковіду, што будзе цяпер, вельмі складана прадказаць. Я думаю, сёння ніхто не ведае, што будзе заўтра...», — заўважыў Юрый Радыёнаў.

### БОКС (24 ліпеня — 8 жніўня)

Самымі паспяховымі для беларускага бокса выдаліся Алімпійскія гульні 2004 года. Тады сярэбраныя медалі заваявалі Віктар Зуеў і Магамед Арыпгаджыеў. Цяпер прыйшоў час мяняць «безмедальныя» традыцыі. Дзеля гэтага ў Токіа едзе беларускі дэсант, які цвёрда ведае, што ад яго патрабуецца.

«Мы прайшлі вельмі вялікі шлях для таго, каб трапіць на Алімпійскія гульні і з улікам ковідных абмежаванняў і спыненнем ды адменай кваліфікацыйных тураў. І пры гэтым нам удалося заваяваць чатыры алімпійскія ліцэнзіі. Гэта найлепшы вынік за тры апошнія алімпійскія цыклы. Да Алімпіяды хлопцы рыхтаваліся на зборы ва Уладзівастоку, які па клімаце і часавых паясах адпавядае Токіа, каб прыехаць у Японію ў максімальнай форме. Настрой баявы, энергічны, таму што ва ўсіх стаіць вельмі важная задача — заваяваць алімпійскі медаль. Як бы гэта іранічна ні гучала ад баксёраў, будзем біцца за медаль да апошняга», — упэўнены **выканаўчы дырэктар федэрацыі бокса Дзяніс САБАЛЕЎСКІ.**

### ЦЯЖКАЯ АТЛЕТЫКА (24 ліпеня — 4 жніўня)

Нягледзячы на «цяжкасць» гэтага віду спорту, беларусам не прывыкаць заваёўваць медалі Алімпійскіх гульняў і іншых міжнародных турніраў. Нават насуперак шматлікім допінгавым скандалам, праз якія алімпійскую квоту для Беларусі значна скарацілі. Не перашкодзіць тое абмежаванне і ў Токіа, перакананы **Валянцін КАРОТКІН, галоўны трэнер зборнай Беларусі.**

«Ва ўсіх пазітыўны настрой. Вядома, усе абмежаванні і строгія меры трохі напружваюць. Але мы будзем старацца трымацца адзін аднаго. Так настройваемся, як гэта будзе на месцы — паглядзім. Але мы і на базе, і на іншых спаборніцтвах ужо прывыклі да такіх умоў. Псіхалагічны ціск на спаборніцтвах заўсёды ёсць, але ж трэба выступаць», — сказаў ён.

### СТРАЛЬБА З ЛУКА (23 ліпеня — 31 ліпеня)

Дадзены від спорту — адзін з самых старажытных, узрост некаторых выяў людзей з лукам больш за 7 тысяч гадоў. Сёння стральба з лука лічыцца самым бяспечным спортам — траўмы атрымлівае адзін спартсмен з 2000. На Алімпійскіх гульнях Беларусь прадстаўляць тры спартсменкі на чале з **галоўным трэнерам Кацярынай ЦІМАФЕЕВАЙ.**

«На жаль, у нас мала часу на акліматызацыю. Мы прасіліся на збор у Японію, але японцы нам адмовілі. Наша надвор'е гэтым летам таксама не самае простае, і мы ўжо трэніраваліся ў гарачых умовах. Думаю, што і ў Токіа справімся.

Калі б у нас была мужчынская ліцэнзія, мы б больш радаваліся. Тады мы мелі б магчымасць выставіць каманду ў міксце. А так усё ляжа на жаночыя плечы», — расказала яна.

### КОННЫ СПОРТ (24 ліпеня — 7 жніўня)

Ён выступае як сімвал цеснай сувязі чалавека і прыроды. Застацца раўнадушнымі да моцных, грацыёзных «спартсменаў» з глыбокімі вачыма і шаўкавістай грывай, якія нясуць на сабе вершнікаў і выконваюць прыгожыя трукі, амаль немагчыма. Як паведамляе афіцыйны сайт Беларускай федэрацыі коннага спорту, гарачыя ўмовы надвор'я, якія ўстанавіліся ў Беларусі апошнія два тыдні, унеслі пэўныя карэктывы ў падрыхтоўку нашых алімпійцаў і іх чатырохногіх партнёраў. Разам з тым, згаданая акалічнасць дала магчымасць праверыць, як спартыўныя пары пераносяць павышаныя нагрузкі пры тэмпературы амаль як у Токіа. Акрамя таго, у Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі ў Ратамцы, дзе праходзіў цэнтралізаваны збор, ёсць унікальная магчымасць дадаць да стандартных трэніровак плаванне для коней у якасці рэабілітацыйнага мерапрыемства.

### СКАЧКІ НА БАТУЦЕ (30—31 ліпеня)

На мінулых Алімпійскіх гульнях 2016 года ў Рыа беларус Уладзіслаў Ганчароў стварыў сенсацыю, выйграўшы «золата». Да яго выступлення абсалютнымі лідарамі лічыліся кітайскія спартсмены. Скокнуць вышэй галавы і зрабіць немагчымае беларусы пастараюцца і ў Токіа. А як іначай?

«Настрой баявы, хлопцы гатовыя. Вядома, абмежаванні, звязаныя з ковідам, сваю лепту ўнясуць, але мы ўжо прывыклі да такіх умоў. І будзем спаборнічаць, рабіць усё, што ад нас залежыць», — паведаміла **галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Вольга УЛАСАВА.**

**Матэрыял падрыхтавала Валерыя СЦЯЦКО.**

Статусбанк

**ОАО «СтатусБанк»**
www.stbank.by

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
## на 1 июля 2021 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2021 | 01.01.2021 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 4 350 | 3 779 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 1 643 | 1 991 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 22 711 | 12 441 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | - | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 48 406 | 56 715 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 2 327 | 2 504 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | - | - |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 429 | 1 003 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 79 866 | 78 433 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 319 | 1 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 10 255 | 10 431 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 907 | 968 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 11 481 | 11 400 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 43 000 | 43 000 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 13 785 | 13 785 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 21 | 24 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 11 579 | 10 224 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 68 385 | 67 033 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 79 866 | 78 433 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
## на 1 июля 2021 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2021 | 01.07.2020 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 4 973 | 6 773 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 75 | 1 519 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 4 898 | 5 254 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 745 | 2 859 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 347 | 684 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 398 | 2 175 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 438 | 3 106 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 19 | (41) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | (1 050) | 393 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 593 | 1 165 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 5 420 | 8 930 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 159 | 606 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 1 817 | 1 730 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 466 | 501 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 1 351 | 1 229 |

Председатель Правления А.В. Игнатов

Главный бухгалтер С.С. Ящук

Дата подписания: 15 июля 2021 г.

УНП 807000043

# РУП «Торговый дом «Восточный»

## извещает о проведении 12.08.2021 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства

**Лот № 1.** Незарегистрированное капитальное строение общей площадью 22,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, 1А/36, блок 10, ГСПК «Рудник-шлам». Расположено на земельном участке с кадастровым номером 625000000012000088 площадью 4,1736 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 1 134,00 бел. рублей, задаток – 113,40 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 2.** Изолированное помещение с инвентарным номером 610/D-10646, общей площадью 7,1 кв. м расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Демина, д. 39, пом. 36. Назначение: изолированное помещение № 36 торгового ряда № 13, наименование: изолированное помещение № 36 торгового ряда № 13. **Начальная цена продажи – 5 281,44 бел. рублей, задаток – 528,14 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 3.** Изолированное помещение с инвентарным номером 123/D-3909 общей площадью 36,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Кобринский р-н, г. Кобрин, ул. Дружбы, д. 6, кв. 66. Назначение: квартира; наименование: квартира № 66. **Начальная цена продажи – 25 137,00 бел. рублей, размер задатка – 2 513,70 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 4.** Капитальное строение с инвентарным номером 311/С-49193 общей площадью 166,9 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Добрушский район, Рассветовский с/с, 10, здание пилорамы. Назначение: здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель. Наименование: здание пилорамы, инв. № 0103. Составные части и принадлежности: одноэтажное блочное здание. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 321286605601000130 площадью 0,3008 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 15 192,00 бел. рублей, размер задатка – 1 519,20 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 5.** Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-50193 общей площадью 51,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, Славгородское шоссе, 44а. Назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции). Наименование: здание автозаправочной станции. Составные части и принадлежности: одноэтажное каменное здание автозаправочной станции. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000007005940 площадью 2,2216 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 16 128,00 бел. рублей, размер задатка – 1 612,80 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 6.** Земельный участок с кадастровым номером 623881700034000105 площадью 0,0676 га, расположенный по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Красненский с/с, садоводческое товарищество «Монолит-92», У-109. Целевое назначение: земельный участок для ведения коллективного садоводства (право собственности). **Начальная цена продажи – 2 700,00 бел. рублей, задаток – 270,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 7.** Объект недвижимости в составе незавершенного незаконсервированного капитального строения, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624883000601000106 общей площадью 0,2499 га (право собственности) по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, Озерицко-Слободской с/с, д. Багута. **Начальная цена продажи – 70 740,00 бел. рублей, задаток – 7 074,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 8.** Земельный участок с кадастровым номером 724884000002000056 площадью 0,0997 га, расположенный по адресу: Могилевская обл., Осиповичский р-н, Протасевичский с/с, СТ «Верейцы». Целевое назначение: земельный участок для коллективного садоводства (право собственности). **Начальная цена продажи – 1 008,00 бел. рублей, задаток – 100,80 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 9.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816269 общей площадью 15,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-135. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 39). **Начальная цена продажи – 15 957,00 бел. рублей, задаток – 1 595,70 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 10.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816272 общей площадью 14,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-119. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 42). **Начальная цена продажи – 15 552,00 бел. рублей, задаток – 1 555,20 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 11.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816271 общей площадью 14,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-118. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 43). **Начальная цена продажи – 15 309,00 бел. рублей, задаток – 1 530,90 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 12.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816270 общей площадью 15,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-117. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 44). **Начальная цена продажи – 16 119,00 бел. рублей, задаток – 1 611,90 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 13.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816274 общей площадью 15,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-115. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 46). **Начальная цена продажи – 15 714,00 бел. рублей, задаток – 1 571,40 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 14.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816273 общей площадью 14,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-114. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 47). **Начальная цена продажи – 15 552,00 бел. рублей, задаток – 1 555,20 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 15.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816275 общей площадью 16,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-112. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 49). **Начальная цена продажи – 16 524,00 бел. рублей, задаток – 1 652,40 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 16.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816276 общей площадью 14,2 кв. м, расположенное по адресу: г.Минск, ул. Лукьяновича, 2В-198. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 56). **Начальная цена продажи – 11 826,00 бел. рублей, задаток – 1 182,60 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 17.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816277 общей площадью 14,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-201. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 59). **Начальная цена продажи – 11 907,00 бел. рублей, задаток – 1 190,70 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 18.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816278 общей площадью 15,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-205. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 63). **Начальная цена продажи – 12 393,00 бел. рублей, задаток – 1 239,30 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 19.** Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-67224, общей площадью 24,4 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Ковзана Б.И., 84/875. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: гараж 875, ПГСК № 12. Составные части и принадлежности: погреб. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 741000000010000108 площадью 0,8555 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 820,80 бел. рублей, задаток – 82,08 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 20.** Объект недвижимости в составе незавершенного незаконсервированного капитального строения с инвентарным номером 614/U-37101, площадью 169,2 кв. м (*согласно ведомости технических характеристик от 17.02.2021)*, расположенное по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, Заболотский с/с, д. Гончаровка, ул. Полевая, д. 10. Назначение: здание неустановленного назначения; наименование: жилой дом. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624882001601000256 площадью 0,1516 га (право пожизненного наследуемого владения). **Начальная цена продажи – 85 633,20 бел. рублей, задаток – 8 563,32 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

3. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Недвижимость».

**Аукцион состоится 12.08.2021 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318, зал для аукционов.**

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) **с отметкой банка**, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318 (управление реализации недвижимости и арендных отношений) в рабочие дни: пн.–чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15.

**Окончание приема заявлений – 09.08.2021 в 15.00.**

Задаток перечисляется на расчетный банковский счет BY07 MMBN 3012 0000 0101 0165 3934, БИК MMBN BY22, в ОАО «Банк Дабрабыт», г. Минск, ул. Коммунистическая, 49, пом. 1, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633, ОКПО 37411910. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом **12 августа 2021 года.**

Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменном указанию Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным.

**Контакты организатора аукциона:**
**+375 17 378 87 02; +375 17 378 87 03; +375 44 763 62 63.**

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
### по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в дер. Малое Залужье, участок 3 (объект 26/2020), дер. Прилепская Усяжка (объект 169/2017), дер. Прилепы, ул. Школьная, участок 2 (объект 33/2020) Озерицко-Слободского сельсовета, Смолевичского района, Минской области

***Организатор аукциона: Озерицко-Слободской сельский исполнительный комитет, 222215, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, д. 27, Смолевичский район, Минская область***

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | дер. Малое Залужье, участок 3 | 624883006601000152 | 0,1045 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | 10000 |
| 2 | дер. Прилепская Усяжка | 624883008201000127 | 0,0814 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | 12000 |
| 3 | дер. Прилепы, ул. Школьная, участок 2 | 624883008301000585 | 0,1267 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | 30000 |

**Аукцион состоится 25 августа 2021 г. в 15.00 в Озерицко-Слободском сельском исполнительном комитете по адресу: аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Смолевичский район, Минская область, зал заседаний (тел.: 801776, 68030).**

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/, Смолевичского райисполкома: isp@smolevichi.gov.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона, оператор ЭТП** | **ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: info@torgi24.by** |
| **Продавец** | **ООО «Автоспартак», УНП 691573894, 220112, г. Минск, а/я 21** |

**Предмет электронных торгов:**

| Лот | Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена |
|---|---|---|
| 775 | **Автобус-вагон MAN 18.350,** 1997 года выпуска, цвет – белый, регистрационный номер АН 0756-5, свидетельство о регистрации ОАА 206536, кузов (рама) NoWMAA510715W030168 | 17 950 |

**Имущество расположено по адресу:**
Минская обл., Узденский р-н, г. Узда, пер. Колхозный, 5

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (**для каждого лота**) перечисляется на р/с (IBAN): BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код. (BIC): UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** (пять) рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель торгов (претендент на покупку), обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 10 (десяти) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки ООО «Расантехторг», размещенным по адресу: www.torgi24.by**

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **5 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту (для каждого лота) – не более **1000,00 бел. руб.**

**Дата и время начала торгов: 05.08.2021** в 09.00.
**Дата и время окончания торгов: 05.08.2021** в 16.00.
Торги продлеваются на 3 минуты с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 3 минуты до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок: 03.08.2021 до 17.00** на ЭТП ООО **«Расантехторг»** по электронному адресу: **www.torgi24.by**

**Контактные данные: +375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87.**
**E-mail: info@torgi24.by.**

Кніжны гасцінец

# Рэкламшчыкі, бабры і іншыя звяры

**Дзіцячы атлас Беларусі. Звяры. «Мастацкая літаратура», Мінск, 2021.**




Вы ведалі, які самы буйны звер Беларусі, а які самы маленькі? На колькі метраў можа скочыць рысь падчас атакі і якой даўжыні рыюць норы бабры? Разам з дзіцем вы можаце пра ўсё гэта (і яшчэ шмат чаго іншага) даведацца, а заадно яшчэ больш спазнаць родную зямлю. Выдатная серыя беларускіх дзіцячых атласаў працягваецца... У ранейшых выпусках распавядалася пра выдатных людзей нашай гісторыі, пра замкі і помнікі, легенды і паданні, а таксама птушак, якія ў нас жывуць. Цяпер прыйшоў час пазнаёміцца са светам звяроў. Дзякуючы складальніцы Паліне Грынчанцы ў кнізе сабрана шмат захапляльных фактаў — і не толькі пра звяроў Беларусі. Паколькі гэта атлас, чытачу прапануецца азнаёміцца з жывёльным светам у звязцы з картамі, ад вобласці да вобласці, а таксама, дзякуючы слоўнічкам, папоўніць свае веды спецыяльнымі тэрмінамі, такімі як «інтрадуцэнт» і «лёхі». Многія чулі пра каня Пржавальскага, адкрытага падарожнікам беларускага паходжання ў далёкіх стэпах... А вось з 2007 года гэты конь родам з Кітая і Манголіі пасяліўся ў Палескім радыяцыйна-экалагічным запаведніку.

«Былыя ворныя землі ў запаведніку ператварыліся ў лугі, дзе коні пасвяцца круглы год. Узімку жывёлы наведваюць закінутыя вёскі, сілкуюцца яблыкамі і грушамі здзічэлых пладовых дрэў. Ядуць таксама галінкі і парасткі маладых бярозак, хвоі, кустоў. На адпачынак уладкоўваюцца ў пустых камяніцах кароўнікаў, свінакомплексаў. Пасвяцца і робяць пераходы звычайна ўначы; удзень адпачываюць на ўзвышэнні для лепшага агляду наваколля. На час сну коні збіраюцца ў кола галовамі ўсярэдзіну, унутр змяшчаюць жарабят».

Ці не праўда, з гэтага апісання атрымалася б яскравая дэталь для мастацкага твора пра сучасную Беларусь?

На ілюстрацыях можна ўбачыць, і як начуюць кажаны, і як уладкавана бабровая хатка, а ў канцы — забавіць маленькага чытача беларускімі загадкамі, прыказкамі і прымаўкамі пра жывёл. Раю ўсім, у каго ў доме ёсць дзеці, збіраць поўную серыю гэтых атласаў.

**Фрэдэрык Бегбедэр. 99 франкаў. «Азбука», Масква, 2020.**




Калі дваццаць гадоў таму з'явіўся гэты раман, ён адразу стаў бестселерам... А аўтар дамогся таго, дзеля чаго пісаў: яго звольнілі з ненавіснага рэкламнага агенцтва, узамен прывалілася літаратурная слава. Столькі атруты ў сваю сацыяльную сатыру замешваў мала хто... Свет спажывання, вечны падман з боку вытворцаў, навязаны сродкамі масавай інфармацыі каштоўнасці... Фрэдэрык Бегбедэр выглядаў нават тым, што да яго ніхто не крытыкаваў свет нажывы — а таму, што валодаў фактурай рэкламнага бізнесу, таму засыпаў чытача пазнавальнымі і ўражальнымі дэталямі. «Фірма «Барбі» прадае дзве лялькі ў секунду ва ўсіх краінах свету. 2,8 мільярда насельнікаў нашай планеты жывуць менш чым на два долары ў дзень. 70 % людзей не маюць тэлефона, а 50 % жывуць у дамах без электрычнасці». І на гэтым фоне — фарсы, як цынічныя рэкламшчыкі здаюць свае ролікі тупым багацюткім заказчыкам. Карацей, у чытача ўражанне, што яму адкрываюць вочы на сусветную змову. Сёння раман перааэсэсоўваюць, кажуць пра некаторую наіўнасць, пошлыя жарты і псіхалогію падлетка, які злуецца на ўсіх... Тым не менш раман з гісторыі літаратуры ніхто не выкіне, пры ўсім яго «шакавальным кантэнце». У твора Бегбедэра з'явілася шмат перайманьнікаў. Бо навучыцца крытычна мысліць — ніколі не лішняе: паглядзіце, як хітра вам прадаюць «патрэбныя» ёгурт, шампунь, аўтамабіль, эталон жаночай прыгажосці... І падумайце, чаму людзі, якія маюць усё, пра што вы толькі марыце, — той жа герой рамана Актаў — такія нешчаслівыя... Разумныя людзі, якія паддаюцца спакусе камфортнага існавання, аддаюць талент на службу сусветнаму Молаху, гінуць як асобы. «Я рэкламіст: так-так, гэта менавіта я засмечваю наваколльнае асяроддзе. Я — той самы тып, што прадае вам рознае лайно. Той, што змушае вас марыць аб рэчах, якіх у вас ніколі не будзе. Аб вечна блакітных нябёсах, аб нязменна спакусілівых красунях, аб ідэальным шчасці, прыхарошаным у Photoshop'е. Залізаныя малюнкі, модныя матыўчыкі. Але калі вы, зацягнуўшы паясы, збераце грошыкі і купіце нарэшце машыну — мяжу вашых мараў, яна маімі намаганнямі даўно-даўно выйдзе з моды... Зрабіць так, каб вы ўвесь час слінкі пускалі — вось яна, мая найвышэйшая мэта».

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

**Выданні для агляду прадстаўлены кніжнай крамай «Акадэмічная кніга», Мінск, пр-т Незалежнасці, 72.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.07 | 21.24 | 16.17 |
| Віцебск — | 4.50 | 21.20 | 16.30 |
| Магілёў — | 4.57 | 21.14 | 16.17 |
| Гомель — | 5.02 | 21.03 | 16.01 |
| Гродна — | 5.24 | 21.38 | 16.14 |
| Брэст — | 5.32 | 21.31 | 15.59 |

## Месяц

*Першая квадра 17 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Казярога.*

## Імяніны

*Пр. Аляксандра, Кірылы, Панкрата, Фёдара.*
*К. Марыі, Магдалены, Лаўрэнція.*



Фота Алены ДАЎЖАНОК.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**22 ЛІПЕНЯ**

У краіне

**1906** год — на Стаўбцоўшчыне, у вёсцы Мікалаеўшчына, пачаўся нелегальны з'езд настаўнікаў Мінскай губерні. Прысутнічала 16 чалавек, адным з арганізатараў быў паэт і настаўнік Якуб Колас. З'езд прыняў рэзалюцыю аб стварэнні настаўніцкага саюза, выбраў часовае бюро, заклікаў настаўнікаў змагацца за свае сацыяльныя, нацыянальныя і прафесійныя правы, за звяржэнне самадзяржаўя. Паліцыя арыштавала ўсіх удзельнікаў з'езда, яны былі звольнены з работы і больш за два гады знаходзіліся пад следствам.

**1936** год — нарадзілася Валянціна Іванаўна Гаявая, балетмайстар, народная артыстка Беларусі. З 1967 года кіраўнік дзіцячай харэаграфічнай студыі ў Магілёве. З 1974-га — мастацкі кіраўнік і галоўны балетмайстар Беларускага фальклорна-харэаграфічнага ансамбля «Харошкі». На аснове фальклорнага матэрыялу стварае арыгінальныя пастаноўкі беларускіх народных танцаў, вакальна-харэаграфічныя кампазіцыі, харэаграфічныя мініяцюры. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**1941** год — кавалерыйская група пад камандаваннем генерал-маёра А. І. Гарадавікова нанесла контрудар па нямецкіх войсках, фарсіравала раку Пціч, вызваліла Глуск, Старыя Дарогі, Асіповічы.

У свеце

**1502** год — у Лісабон вярнуліся ўдзельнікі партугальскай экспедыцыі, у якой у якасці астранома браў удзел Амерыга Веспучы. Гэтае плаванне прынесла яму сусветную славу як першаадкрывальніку Новага Свету, як тады называлі Паўднёвую Амерыку, што пралягала на поўдзень ад экватара.

**1596** год — нарадзіўся Міхаіл Фёдаравіч Раманаў, рускі цар, першы з дынастыі Раманавых. 3 сакавіка 1613 года з ініцыятывы баярства абраны на маскоўскі прастол на Земскім саборы.

**1894** год — у Францыі прайшлі першыя аўтамабільныя спаборніцтвы, арганізаваныя газетай Le Petit Journal: 102 удзельнікі выйшлі на старт гонкі Парыж — Руан працягласцю 126 км. Перамог паравы аўтамабіль маркі De Dion-Bouton маркіза Жуля-Альбера дэ Дзьёна, аднак прыз яму не быў уручаны, бо суддзі палічылі, што наяўнасць качагара ў аўтамабілі не адпавядала правілам гонкі.



**1930** год — Калгасцэнтр СССР устанавіў ацэнку і аплату працы ў калгасах не ў грашах, а ў працаднях.

Так гаварыў...

**МАКІЯВЕЛІ:**

*«Найменшае зло варта лічыць дабром».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Муж з жонкай глядзяць фільм жахаў. На экране з'яўляецца ведзьма.**

**Жонка:**

**— Ой, мама!**

**Муж:**

**— Пазнала, так?**

Аб'ява ў пад'ездзе:

«У сувязі з работамі ў вашым доме на тыдзень будзе адключана вада. За асобную плату можам адключыць ваду і ў суседнім доме, каб вам было не так крыўдна».




Вожык

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1888.

Нумар падпісаны ў 19.30 21 ліпеня 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12